Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 СТУДЗЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 3 (27861) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Новы від школьнага анкетавання

СТАР. 3



## Спецыяльны прафілакторый для дармаедаў

СТАР. 4



## Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Любы зварот грамадзяніна з'яўляецца сігналам для кіраўніка, якія, як правіла, сведчыць пра тую ці іншую праблему. Звычайна такія звароты становяцца падставай праінспектаваць дзейнасць чыноўнікаў або арганізацыі, вывучыць пытанне. А ёсць звароты з-за недахопу інфармацыі — чалавеку проста трэба ўсё своечасова растлумачыць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.01.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 13760,00 | ▲ |
| Еўра | 16240,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 221,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 869,24 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Здароў, скрыпучы, мяккі снег!



Фота БЕЛТА.

■ Грошы

## ЗБОР — МІНУС, СТАЎКА — ПЛЮС

### Адменена камісія на куплю валюты, а стаўка рэфінансавання паднімаецца да 25% гадавых

**З улікам абнулення з 8 студзеня падатку на біржавыя аперацыі па набыцці замежнай валюты (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2015 года № 5) праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне аб адмене ад сёння камісійнага збору пры куплі замежнай валюты насельніцтвам.**

«Гэты захад закліканы ўніфікаваць абменныя курсы куплі-продажу ў розных сегментах валютнага рынку, у тым ліку ў абменных пунктах банкаў, і наблізіць іх да афіцыйнага курсу беларускага рубля», — патлумачылі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. Між іншым, па выніках таргоў на Беларускай валютна-фондавай біржы 1 долар ЗША цяпер каштуе 13 760 беларускіх рублёў, 1 еўра — 16 240, а 1 расійскі рубель — 221.

Акрамя гэтага, ад сёння Нацбанк аднаўляе выкарыстанне механізму прывязкі курсу беларускага рубля да кошыка замежных валют. У структуры кошыка доля расійскага рубля павялічваецца да 40%, а долі еўра і долара зніжаюцца да 30% кожная. У межах новага механізму становяцца больш жорсткімі падыходы да выкарыстання золатавалютных рэзерваў для падтрымкі абменнага курсу. Валютныя інтэрвенцыі будуць праводзіцца толькі для згладжвання пікавых ваганняў кошту кошыка замежных валют у аб'ёмах, якія забяспечваюць станоўчае сальда куплі-продажу Нацбанкам замежнай валюты ў сярэднетэрміновым перыядзе.

СТАР. 3

■ Надвор'е

## РЭЗКА ПАЦЯПЛЕЕ, АЛЕ ЗАСНЕЖЫЦЬ

### А ў нядзелю нават дождж і вецер да 20—25 м/с

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў актыўных атмасферных франтоў, якія рухаюцца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Міністэрства прыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

І ў суботу паўсюдна будзе ісці снег і мокры снег. Па паўднёвым захадзе краіны ён будзе чаргавацца з дажджом. У асобных раёнах магчымы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Месцамі захаваецца моцны вецер парывамі да 15—18 м/с. Уначы на суботу будзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, аднак па паўночным усходзе чакаецца яшчэ 6—10 °С марозу. Удзень тэмпературны фон складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей — да 6 °С цяпла.

У нядзелю на тэрыторыю Беларусі завітае глыбокі актыўны цыклон, які рухаецца з боку поўдня Нарвегіі на Фінскі заліў. Зноў пойдзе мокры снег, а на поўдні краіны — дождж. Надвор'е сапсуецца цалкам. **Увага! Прагназуецца моцны вецер парывамі да 17—23 м/с, а месцамі — нават да 25 м/с.** Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня чакаецца снег і мокры снег. Крыху пахаладае. Уначы на панядзелак чакаецца 0—6 °С марозу, а ўдзень — ад мінус 4 да плюс 3 градусаў. Надалей у нас чакаецца няўстойлівае надвор'е з моцным ветрам і ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Сіноптыкі ўпэўнены, што даволі ветрана і вільготна на тэрыторыі краіны будзе на працягу амаль усяго наступнага тыдня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У нашай краіне заўсёды будзе мірна і спакойна

**Упэўненасць у гэтым выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, які па традыцыі 7 студзеня, у свята Раства Хрыстовага, наведаў Мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх з гэтым светлым святам і пажадаў дабра, міру ў сем'ях, краіне, а галоўнае — у душах.**

Прэзідэнт падзякаваў Царкве за той вялікі ўклад, які яна ўносіць у справу ўмацавання міру і спакою на беларускай зямлі. Выказваючы самыя добрыя пажаданні ў сувязі са святам, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Вы можаце абапірацца на дзяржаву, уладу. Заўсёды можаце быць упэўнены, што ў нашай краіне будзе мірна і спакойна. Гэта мы гарантуем».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў: «Думаю, што гэты няпросты год мы пройдзем паспяхова і падставы для таго — дабрыня і жаданне нашых людзей жыць у міры на зямлі, падоранай нам Госпадам».

«Віншую ўсіх беларусаў, усіх нашых сяброў, братоў, суседзяў. Жадаю ім таксама міру і дабра, а самае галоўнае — міру нашай роднай паўднёвай суседзі. Я думаю, мы ўсё зробім для таго, каб былі мір і спакой у душах і сэрцах гэтых такіх блізкіх нам людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы разам са сваім малодшым сынам Мікалаем запаліў свечку каля Мінскага абраза Божай Маці.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ўручыў Аляксандру Лукашэнку абраз Божай Маці «Траяручыца», які прывезены з гары Афон і вельмі шануецца ў свеце.

Прэзідэнт падарыў Беларускай Праваслаўнай Царкве сувенірнае пано, — паведамляе БЕЛТА. На ім рэльефна адлюстраваны Крыжаўзвіжанскі сабор у Полацку. Пано выраблена з серабра ў тэхніцы чаканкі і размешчана на кардоннай аснове. Крыжаўзвіжанскі сабор, пабудаваны ў 1893 годзе, уваходзіць у комплекс Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. У гэтым саборы захоўваюцца мошчы святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

# Ва ўпартай барацьбе

## Зборная Расіі трэці раз стала трыумфатаркай Каляднага турніру сярод аматараў хакея



Фота БЕЛТА

**Да фіналу ніякіх неспадзяванак турнір не ведаў: да вырашальнага паядынку ўпэўнена дайшлі фаварыты спаборніцтваў — каманды Беларусі і Расіі. Але, перш чым сустрэцца на малой пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны», абедзве зборныя здабылі па тры перамогі на групавой стадыі. Прычым кожнай з іх супрацьстаялі досыць моцныя каманды — Швейцарыя, Фінляндыя, Латвія, якія папеплі добра «разагрэць» неаднаразовых чэмпіёнаў турніру.**

...Трыбуны «Чыжоўка-Арэны» стракацелі беларускімі і расійскімі сцяжкамі, а дзяўчаты з групы падтрымкі дынамаўскіх «зубраў» забаўлялі публіку, якая патрабавала мноства закінутых шайбаў і прыгожай гульні. Пershага, на жаль ці, наадварот, на шчасце, не здарылася, другога — хапіла ўдосталь. Гульнявая сітуацыя на лёдзе змянялася кожныя 10 хвілін: то адна, то другая каманда авалодвала перавагай. Але расійская зборная аказалася больш удачлівай. Спачатку вароты нашай каманды паразіў Аляксей Яшын, які некалі гуляў у НХЛ, а ў другім перыядзе яго пачынанне падтрымаў чэмпіён свету па хакеі 1993 года Ігар Варыцкі. Беларусы з усіх сіл спрабавалі адказаць выніковай атакай, але галкіпер гасцей Андрэй Малкаў тварыў сапраўдныя дзівосы, не раз выратоўваючы вароты сваёй каманды ад паражэння. Нядзіўна, што адным з лепшых гульцоў фінальнага матча прызналі менавіта варатара расійскай зборнай. Пасля цырымоніі ўзнагароджання Андрэй Віталевіч падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» эмоцыямі ад перамогі:

— Заўжды люблю вяртацца ў Беларусь, дзе ў свой час адпрацаваў амаль што два гады ў «Хіміку-СКА». Шчыра кажучы, не вельмі разлічвалі на перамогу, бо беларуская каманда вельмі моцная і гуляе дома. Дарэчы, падтрымка сёння была проста шалёная. Прыемна, што і нашай камандзе дасталася значная порцыя ўвагі. Асобны дзякуй Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь за падтрымку традыцый, за такі цудоўны турнір і цёплыя словы ў наш адрас.

Між іншым, другім лепшым гульцом фіналу стаў форвард беларускай зборнай Сцяпан Панамароў — экс-гулец «Юнацтва» і «Кераміна», а цяпер — дзіцячы трэнер ДзЮСШ на базе мінскага «Дынама».

А вось у матчы за «бронзу» спрацаваў ранейшы прынцып: гуляюць дзве каманды, а перамагаюць фіны. Хакеісты з краіны суомі пяты раз занялі трэцяе месца на Калядным турніры. Сёлета скандынавы перайгралі зборную Славакіі — 8:6. Дарэчы, фінскі хакеіст Акі Петэры Туомінен атрымаў прыз лепшага абаронцы турніру. Лепшым нападаючым назвалі форварда пераможцаў Аляксея Яшына, а ў спрэчцы бамбардзіраў перамога дасталася члену беларускай каманды Генадзю Савілаву, які набраў 12 (4+8) ачкоў па сістэме «гол+пас».

Адзначу нядрэннае выступленне дэбютантаў турніру — хакеістаў з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, якія фінішавалі пятымі, апярэдзіўшы, напрыклад, каманды Латвіі, Швейцарыі і Германіі.

Цікава, якія краіны далучацца да нашай хакейна-каляднай традыцыі ў наступным годзе?

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

■ Узровень

# ДОСЛЕДЫ — ВІРТУАЛЬНЫЯ, ВЕДЫ — РЭАЛЬНЫЯ

## У БДПУ адкрыліся прадметныя віртуальныя класы

**«У XXI стагоддзі важным элементам падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да педагагічнай дзейнасці стане іх паглыбленне ў высокатэхналагічнае асяроддзе», — лічыць рэктар БДПУ імя Максіма Танка Аляксандр ЖУК. Напрыканцы года ў галоўным педагагічным універсітэце краіны быў запушчаны інфармацыйна-адукацыйны праект «Мультысэрвіснае інфармацыйнае адукацыйнае асяроддзе».**

У рамках праекта ва ўніверсітэце адкрыліся прадметныя інтэрактыўныя класы па матэматыцы, фізіцы, біялогіі і хіміі. Камп'ютар, інтэрактыўная дошка, праектар, абсталяванне для лабараторных доследаў, дакумент-камера — усё гэта аб'яднана ў адзіную сістэму. Напрыклад, на занятках па хіміі цяпер можна будзе праводзіць віртуальныя доследы, дабаўляючы ў намаляваную прабірку неабходныя рэчывы. Што з гэтага атрымаецца, пакажа камп'ютар, які перадасць выяву на інтэрактыўную дошку. На занятках па біялогіі можна працаваць на дошку выяву з электроннага мікраскопа. На занятках па фізіцы — дэманстраваць аптычныя эксперыменты і карыстацца віртуальнай лінейкай. Прычым выкладчыкі могуць тэсціраваць студэнтаў у рэжыме рэальнага часу — у кожнага ёсць свой пульт для адказаў. Камп'ютар фіксуе ўсе адказы і можа выводзіць іх на інтэрактыўны экран.

Яшчэ адзін важны элемент — інтэрактыўны планшэт. Пра гэтую прыладу яшчэ некалькі гадоў таму педагогі маглі толькі марыць. Планшэт дазваляе выкладчыку адпраўляць усю інфармацыю на інтэрактыўную дошку, знаходзячыся ў любых месцах аўдыторыі, паколькі ён звязаны і з камп'ютарам, і з праектарам бесправадной сувяззю.

— Стратэгічная мэта нашага ўніверсітэта — павышэнне якасці адукацыі, а без стварэння інавацыйнага асяроддзя для навучання студэнтаў зрабіць гэта будзе праблематычным, — падкрэслівае Аляксандр Жук. — Таму будучыня, я ўпэўнены, за інтэрактыўнымі класамі...

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# З ЛЕПШЫМІ ТРАДЫЦЫЯМІ — У ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

**25 гадоў таму, у такія ж калядныя дні неспакойнага 1990-га, на медыйным, як сёння модна казаць, рынку Беларусі з'явілася новае выданне — газета «7 дней».**

Аб'ём яе быў вельмі сціплым — усяго 8 старонак «малога» фармату, але газета з першага нумара брала іншым — зместам. Яна адразу стала карыстацца папулярнасцю ў вялікай колькасці чытачоў — звычайных людзей, прадстаўнікоў улады, бізнесу. Сёння «7 дней», захаваўшы ўсё лепшае з савецкай журналістыкі, застаецца адным з лідараў беларускай медыяпрасторы.

Жывы стыль, прынцыповая пазіцыя ў адстойванні духоўных і маральных традыцый нашага народа, сямейных і грамадзянскіх каштоўнасцяў зрабілі яе надзейным сябрам і дарадцам для людзей розных пакаленняў. Яе супрацоўнікі ўсведамляюць сваю адказнасць перад грамадствам і ведаюць кошт друкаванага слова. Гэта, у прыватнасці, было адзначана ў прывітанні Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, накіраваным у адрас калектыву рэдакцыі. Віншаванне зачытаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ.** У сваю чаргу ён пажадаў калектыву рэдакцыі газеты захаваць свой стыль. «На працягу доўгіх гадоў вы захоўваеце найлепшыя традыцыі, адказнасць перад чытачамі, краінай і дзяржавай. Ваша друкаванае выданне расце і ідзе ў нагу з часам, у вас ёсць чаму павучыцца іншым выданням», — сказаў Ігар Бузоўскі, звяртаючыся да супрацоўнікаў рэдакцыі.

**Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**, віншуючы калектыў выдання, адзначыла, што газета знайшла сваю нішу і не стала падобным да нейкага іншага выдання. Нават сама назва, як сказала міністр, вельмі ўдалая: сем дзён будзе, як кажуць, пры любым надвор'і. І сёння новыя інфармацыйныя тэхналогіі дазваляюць газеце, нягледзячы на тое што яна выходзіць раз на тыдзень, быць на сувязі з чытачом штодня. Лілія Ананіч падкрэсліла, што словы Прэзідэнта, якія тычыліся сёння калектыву рэдакцыі газеты «7 дней», абавязваюць падымаць творчую, зместавую і аналітычную планку кожнага друкаванага і электроннага СМІ краіны.

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе з нагоды смерці дырэктара, галоўнага рэдактара выдавецтва «Пачатковая школа» ВАНІНАЙ Наталлі Генадзьеўны і выказвае глыбокае спачуванне яе родным і блізкім.**

**Калектыў РВУ Выдавецкі дом «Звязда» смуткуе з нагоды смерці дырэктара, галоўнага рэдактара выдавецтва «Пачатковая школа» ВАНІНАЙ Наталлі Генадзьеўны і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.**

белагропромбанк
традиции будущего

С 09 января 2015 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 06.01.2015 № 4, размер ставки рефинансирования установлен в размере 25,0 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на 5 процентных пунктов с 09.01.2015.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

**Технический администратор доменной зоны BY**
**УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ»**
**сообщает о проведении благотворительного аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра.**

**Средства от аукциона, кроме стандартной стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.**

Предметом аукциона являются доменные имена в доменной зоне BY, исключенные из реестра национальной доменной зоны. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещается на сайте https://auction.cctld.by.

**Дата начала аукциона – 9 февраля 2015 г., дата окончания аукциона – 19 февраля 2015 г.**

Время начала аукциона – 12.00 даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by.

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона составляет 300 000 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 10 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра, находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов».

**Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by**
**Тел. организатора +375 17 239 57 02.**
**Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.**

■ У свеце

# ТЭРАКТ У ПАРЫЖЫ МОЖА «ПАДПАЛІЦЬ» ЕЎРОПУ

**Беларусы прыносяць у Пасольства Францыі ў Мінску кветкі і свечкі ў памяць пра ахвяр тэракта. Прэзідэнт Францыі аб'явіў у краіне трохдзённую жалобу, на будынку дыпмісіі прыспушчаны сцягі...**

Нагадаем, раніцай 7 студзеня ў Парыжы невядомыя ў масках уварваліся ў рэдакцыю французскага сатырычнага часопіса Charlie Hebdo і адкрылі агонь з аўтаматаў Калашнікава. Загінулі 10 журналістаў і двое паліцэйскіх — гэта найбуйнейшы тэракт у Францыі з 1835 года. Прычынай нападу сталі карыкатурныя публікацыі ў тыднёвіку на ісламскія тэмы.

Тэракт большасць французаў успрыняла не толькі як помсту рэлігійных фанатыкаў за раней размешчаныя ў часопісе карыкатуры на прарока Мухамеда, але і як пагрозу свабодзе слова. Так, у рамках дзеючага заканадаўства краіны сродкі масавай інфармацыі маюць права высмейваць рэлігію — гэты ж часопіс падымаў на смех Каталіцкую царкву і потым выйграў цяжбу з адной каталіцкай арганізацыяй. Згодна з заканатворчымі нормамі большасці еўрапейскіх краін, свабоднае і дэмакратычнае грамадства павінна захоўваць цярпімасць і не можа быць ніякіх выключэнняў для пэўных груп гэтага грамадства, у прыватнасці да мусульман.

Жахлівасць гэтай падзеі не можа не ўразіць, але яшчэ больш страшнымі могуць быць яе наступствы. Як вядома, у Францыі пражывае вельмі шмат мусульман, і значная частка гэтых людзей не працуе або занята ў ценявым сектары эканомікі. У той жа час на фоне гэтай падзеі правыя і ўльтраправыя партыі распачнуць яшчэ больш актыўную ксенафобскую агітацыю — у прыватнасці супраць мусульман, але ў хуткім часе яна можа закрануць і цемнаскурых, лацінаамерыканцаў, выхадцаў з азіяцкіх краін. Але не ўсе мусульмане — тэрарысты, не ўсе цемнаскурыя — рабаўнікі і забойцы. Праз падобную палітыку, «умацаваную» крывавым тэрактам, варожасць да ісламу вырасце, што, як вынік, справакуе раздражненне сярод мусульман — і кола замкнецца. Зласчынства, здзейсненае невялікай групай людзей, стане ў вачах значнай часткі еўрапейцаў сімвалам цэлай рэлігіі.

Асабліва важнай у прадухіленні гэтага выглядае роля палітыкаў. Калі яны пойдуць на павадку ксенафобіі і абагульненняў, то Еўропа ўвогуле можа «ўспыхнуць»: у кожнай краіне кантынента значная колькасць насельніцтва — нееўрапейцы, частка з якіх адкажа на агрэсію агрэсіяй.

* * *

Прэс-служба Прэзідэнта нашай краіны паведамляе, што Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні прэзідэнту Францыі Франсуа Аланду ў сувязі з тэрарыстычным нападам на рэдакцыю выдання Charlie Hebdo і гібеллю людзей.

«У Рэспубліцы Беларусь з глыбокім болем і смуткам успрынялі жахлівую вестку аб тэрарыстычным нападзе на рэдакцыю выдання Charlie Hebdo, у выніку якога загінулі і пацярпелі людзі. Мы рашуча асуджаем любыя формы і праявы тэрарызму і экстрэмізму», — гаворыцца ў спачуванні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

■ Не прапусціце!

# «ВЕЧАРЫ» ЯК БАЛЬ ДУШЫ

## Міжнародны фестываль класічнай музыкі пройдзе ў калядныя дні ў Брэсце

**Студзень — час «Вечароў» (XXVII міжнародны фестываль класічнай музыкі пройдзе ў Брэсце 9—12 студзеня). Больш за 300 вядомых выканаўцаў з 11 краін свету прадэманструюць сваё мастацтва. Запланаваны чатыры вячэрнія і два дзённыя канцэрты. Асноўнымі пляцоўкамі стануць сцэна Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, вялікая і малая залы музычнага каледжа імя Рыгора Шырмы, а таксама касцёл, дзе адбудзецца канцэрт арганнай музыкі.**

Дырэктар і мастацкі кіраўнік фестывалю Лілія Батырава падкрэсліла, што нязменным застаецца найвышэйшы ўзровень прафесійнага майстэрства музыкантаў і выканаўцаў. На яе думку, такую вышыню фестываль трымае на працягу ўсіх 27 гадоў існавання.

«Студзеньскія музычныя вечары» маюць шмат старых сяброў. Але кожны год фэст дорыць сваім аматарам і новыя імёны. Упершыню са сцэны фестывалю выступіць народны артыст Расіі, уладальнік міжнароднай прэміі «Чалавек года» і ордэна «Залатая зорка Айчыны» барытон Сяргей Захараў з Санкт-Пецярбурга. Ён выканае некалькі твораў: арыі з аперэт і опер, а таксама старадаўнія рускія рамансы. Выступленне Сяргея Захарава і адкрые сёлетні фестываль класічнай музыкі.

Таксама ў дзень адкрыцця першую частку канцэрта Рахманінава для фартэп'яна з аркестрам прадставіць слухачам піяніст з Літвы Паўлюс Андэрсан. Ён будзе іграць разам з сімфанічным аркестрам Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа пад кіраўніцтвам Людмілы Жабінскай.

Скрыпач з Малдовы, лаўрэат міжнародных конкурсаў Манчу Ёнел — у ліку навічкоў «Вечароў». Упершыню тут сыграе і піяністка са Швецыі Марыяна Якабс.

Падзеяй сёлетняга фестывалю абяцае стаць опера. Такі жанр заяўлены ў афішы першы раз. Маладзечанскі маладзёжны музычны народны тэатр вязе оперны спектакль у двух дзеях «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт». Сёлета, дарэчы, спаўняецца 250 гадоў з дня нараджэння кампазітара, музыканта, дзяржаўнага дзеяча.

Традыцыйны калядны баль у праграме «Вечароў» заяўлены на 11 студзеня. У гэты ж вечар запланавана выступленне даўняга сябра фестывалю — вядомага піяніста, народнага артыста Беларусі, прафесара Ігара Алоўнікава. А на вечары-закрыцці брастаўчане сустрэнуцца з народным артыстам СССР, салістам Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра Расіі тэнарам Уладзіславам П'яўко. На закрыцці форуму музыкі будзе іграць сімфанічны аркестр Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы пад кіраўніцтвам Аляксандра Сасноўскага.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Будзь у курсе!

# ЦЭНЫ НА ПЛАТНЫЯ МЕДПАСЛУГІ РАСЦІ НЕ БУДУЦЬ

**Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь забараніла павялічваць цэны на платныя медыцынскія паслугі для грамадзян краіны.**

Пра гэта гаворыцца ў пісьме намесніка міністра аховы здароўя Вячаслава Шылы, якое было апублікавана ў ведамаснай газеце «Медыцынскі веснік». Згодна з ім, упраўленням аховы здароўя ў рэгіёнах, кіраўнікам дзяржаўных арганізацый, якія падпарадкаваны міністэрству, суб'ектам гаспадарання недзяржаўнай формы ўласнасці даручана не дапускаць росту цэн на платныя медыцынскія паслугі для грамадзян Беларусі (у тым ліку на расходныя матэрыялы), што аказваюцца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

Апроч таго, кіраўніцтву абласных упраўленняў аховы здароўя, старшыні камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама даручана арганізаваць дакладную сістэму кантролю за змяненнем узроўню цэн на платныя медыцынскія паслугі. Пры выяўленні парушэнняў да кіраўнікоў, якія не забяспечаць выканання гэтага даручэння, будуць прымяняцца меры адказнасці.

**Сяргей СТАРЫНАЎ**

# ЗБОР — МІНУС, СТАЎКА — ПЛЮС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Ваганні курсу беларускага рубля ў адносінах да кожнай з валют (долар ЗША, еўра і расійскі рубель) будуць складвацца як за кошт змянення кошту кошыка пад уплывам попыту і прапановы валюты падчас біржавых таргоў, так і за кошт узаемных зменаў кроскурсаў гэтых замежных валют, — сказалі ў прэс-службе галоўнага банка краіны. — Пры гэтым змены абменнага курса могуць быць як у адзін, так і ў іншы бок. Увядзенне згаданага механізму курсаўтварэння дазволіць больш эфектыўна кіраваць курсам нацыянальнай валюты ў адносінах да замежных валют, якія маюць асноўнае значэнне для знешнеэканамічнай дзейнасці Беларусі, і павысіць устойлівасць беларускай эканомікі да ўздзеяння знешніх фактараў».

Для падтрымання адноснай стабільнасці абменнага курсу беларускага рубля прымаюцца захады эканамічнай, бюджэтна-падатковай і грашова-крэдытнай палітыкі. Нацыянальным банкам таксама прыняты шэраг рашэнняў у галіне працэнтнай палітыкі, скіраваных на фарміраванне ў эканоміцы ўзроўню працэнтных ставак, што забяспечваюць фінансавую і макраэканамічную стабільнасць, запаволенне інфляцыі, а таксама баланс інтарэсаў укладчыкаў і пазычальнікаў. Так, ад сёння стаўка рэфінансавання павялічваецца на 5 працэнтных пунктаў і складзе 25% гадавых. З 14 студзеня працэнтныя стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці банкаў зніжаюцца з 50 да 40% гадавых, стаўка па дэпазітах авернайт павышаецца да 20% гадавых.

Пры гэтым верхняя мяжа працэнтных ставак па дэпазітах юрыдычных асоб зніжаецца з 50 да 40% гадавых. Верхняя мяжа па рублёвых укладах фізічных асоб пакуль захоўваецца на ўзроўні 50%, але па меры далейшай стабілізацыі сітуацыі таксама будзе змяншацца.

У мэтах нівеліравання негатыўных наступстваў зніжэння абменнага курсу для ліквіднасці банкаў зніжаецца нарматыў абавязковых рэзерваў, якія захоўваюцца ў Нацыянальным банку (рэзервовых патрабаванняў), ад прыцягнутых сродкаў у замежнай валюце: у студзені 2015 года — з 13 да 12,5%, у лютым 2015-га — да 10%. Гэта дазволіць падтрымаць устойлівую працу банкаў ва ўмовах недахопу рублёвых сродкаў, які сфарміраваўся ў снежні 2014 года.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### • Тым часам

Па выніках снежня 2014 года золатавалютныя рэзервы Беларусі, згодна з метадалогіяй МВФ, скараціліся на 760,8 млн долараў ЗША і, паводле папярэдніх звестак, на 1 студзеня 2015 года склалі 5 059,1 млн долараў ЗША ў эквіваленце, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

У нацыянальным вызначэнні рэзервы зменшыліся на 691,6 млн і на 1 студзеня склалі 5 716 млн долараў ЗША ў эквіваленце. «На зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў паўплывала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме, а таксама адмоўнае сальда куплі-продажу Нацбанкам замежнай валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы, — каментуюць факт у галоўным банку краіны. — Падтрыманню запасаў спрыялі рэфінансаванне абавязацельстваў Нацбанка, а таксама павелічэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў».

■ Беражыце сябе

# Піратэхніка забрала жыццё

**Спецыялісты кажуць, што падчас святкавання Новага года і Каляды на пляцоўках масавых святочных гулянняў сёлета не былі зарэгістраваны ні злачынствы, ні надзвычайныя сітуацыі. Але святы ўсё ж не абышліся без трагедый...**

— Ахова грамадскага парадку ў месцах масавага збору людзей была забяспечана цалкам, — паведаміў **начальнік упраўлення аховы правапарадку Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Іван КУБРАКОЎ**. — Карціну крыху азмрочылі толькі 45 затрыманых аматараў піратэхнікі ў месцах вялікага збору людзей. Парушальнікі гэтыя былі, як правіла, нападпітку і на папярэджанні супрацоўнікаў міліцыі не рэагавалі. Акрамя таго, праваахоўнікі спынілі дзейнасць 400 нелегальных гандляроў піратэхнікай і канфіскавалі больш за 1,3 мільёна выбуховых вырабаў. Кашалёк патаннеў больш чым у трох тысяч пешаходаў — у паловы праз адсутнасць святлоадбівальных элементаў.

1 студзеня ў краіне забілі чатырох чалавек. І ва ўсіх гэтых злачынствах яскрава прасочваецца алкагольны след. Сем смерцяў здарыліся за першыя чатыры дні 2015-га на дарогах краіны. Адно чалавечае жыццё забрала піратэхніка — звыклы атрыбут навагодніх святаў...

— Васямнаццацігадовы юнак вырашыў адзначыць навагоднюю ноч, як кажуць, з шумам, — гаворыць **начальнік аддзела арганізацыі медыцынскай абароны пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Алег ПАНЧУК**. — Устанавіў магутны піратэхнічны выраб, але той чамусьці не спрацаваў. Хлопец пайшоў зірнуць, што ж там здарылася. І па славутым законе подласці выбухоўка спрацавала якраз у гэтую хвіліну. Зарад прабіў чэрап небаракі і пашкодзіў галаўны мозг. Юнака экстранна шпіталізавалі ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Стан яго ацэньваўся як вельмі цяжкі. Хлопца падключылі да апарата штучнага дыхання. І на Раство днём малады чалавек памёр...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Супраць наркотыкаў

# ТЭСЦІРУЕМ ПРАБЛЕМУ

**Міністэрства адукацыі і Міністэрства аховы здароўя зацвердзілі парадак правядзення псіхасацыяльнага анкетавання і медыцынскага агляду сярод школьнікаў, навучэнцаў і студэнтаў на іх схільнасць да алкаголю, наркотыкаў і іншых псіхаактыўных рэчываў. Мяркуецца, што тэсціраванне будзе праводзіцца штогод і ахопіць школы, прафесійна-тэхнічныя, сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Навучэнцы да 14 гадоў будуць тэсціравацца толькі пры наяўнасці згоды на тое іх бацькоў або законных прадстаўнікоў. Таму педагогі і медыкі спадзяюцца на іх разуменне. Для захавання аб'ектыўнасці на псіхасацыяльным тэсціраванні будуць прысутнічаць прадстаўнікі педагагічнага калектыву і бацькоўскага камітэта.**



Тэсціраванне дазволіць выявіць групы рызыкі, а таксама асоб, якія ўжо спажываюць розныя псіхаактыўныя рэчывы. Па выніках тэсціравання, калі будуць на тое падставы, бацькам могуць прапанаваць звярнуцца разам з дзіцем у профільныя ўстановы аховы здароўя, дзе будзе праводзіцца ўжо медыцынскі агляд (наркалагічнае тэсціраванне).

Акрамя таго, Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам унутраных спраў зацверджаны комплекс мерапрыемстваў па папярэджванні распаўсюджвання алкаголю, наркатычных і псіхатропных рэчываў сярод навучэнскай моладзі. Ён уключае ў сабе мерапрыемствы прафілактычнай накіраванасці. Лекцыі і «круглыя сталы» аб шкодзе спажывання наркатыкаў будуць праводзіць супрацоўнікі праваахоўных органаў і медыкі.

Не сакрэт, што раней, калі ва ўстанове адукацыі выяўляліся факты ўздзелу навучэнцаў у правапарушэннях, педагога маглі пакараць. Напрыклад, калі педагог выяўляў факт спажывання яго вучнем наркатычных рэчываў або алкаголю і пачынаў біць трывогу, то мог пазбавіцца за сваю пільнасць і неабыякавасць прэміі (таму што псаваў станоўчую статыстыку). Магчыма, цяпер педагогі перастануць баяцца пакарання?

Між іншым, па назіраннях медыкаў, першае спажыванне псіхатропных рэчываў адбываецца ўжо ў сярэднім школьным узросце — у 12—14 гадоў. Пераходны ўзрост увогуле вельмі небяспечны: яму ўласцівы экстрэмальныя паводзіны, калі дзеці эксперыментуюць і кіруюцца жаданнем «быць як усе», бо не кожны адважваецца сказаць «не» сваім сябрам і аднакласнікам. Ёсць звесткі, што ў некаторых установах адукацыі небяспечныя курыльныя сумесі спажывалі ад 90 да 100 працэнтаў падлеткаў. Супрацоўнікі МУС даволі часта затрымліваюць маладых людзей у стане яўнага ап'янення, з няўпэўненай паходкай і «шклянымі вачыма», аднак пры медыцынскім аглядзе ні алкаголю, ні якіх-небудзь іншых таксічных рэчываў у крыві не выяўляецца. Тым не менш навучэнская моладзь усё часцей трапляе ў крымінальную хроніку. І звязана гэта як з павелічэннем колькасці падлеткавых злачынстваў у сферы незаконнага абарачэння наркатычных сродкаў, так і з алкагалізацыяй моладзі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Як нас дураць

# НІ ДЖЫПА, НІ ДОЛАРАЎ

**Жыхарка Гродна, жадаючы набыць машыну, знайшла праз інтэрнэт казырны, як ёй здавалася, варыянт. А далей...**

У якасці прадаўца аўтамабіля маркі Jeep Grand Cherokee на адным з замежных сайтаў фігураваў нехта з Вялікабрытаніі. Прычым яго прапанова ў параўнанні з іншымі па аналагічных «колах» была вельмі выгаднай. Ад пакупніка патрабавалася толькі пералічыць грашовым пераводам задатак у памеры 6 тысяч долараў, пасля чаго машына, маўляў, будзе адразу ж накіравана ў Беларусь. Аднак, атрымаўшы грошы, аферыст тут жа спыніў перапіску. Заведзена крымінальная справа, паведамляе прэс-служба УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Дарэчы, праз пару тыдняў пасля гэтага махлярства фотаздымак вышэйзгаданага джыпа з прапановай яго продажу з'явіўся ўжо на іншым сайце. У пошуку чарговай ахвяры — набаракі, які зразумее важнасць шматлікіх прафілактычных папярэджанняў органаў унутраных спраў наконт махлярстваў у інтэрнэце, толькі трапіўшы на «кручок» аферыста. Як гэта нядаўна здарылася з яшчэ адной жыхаркай горада над Нёманам, якой быццам пашчасціла выйграць паўмільёна фунтаў стэрлінгаў. Яна накіравала за мяжу буйную суму валюты «на афармленне дакументаў для атрымання выйгрышу», але, як і ў выпадку з джыпам, аказалася падманутай.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# З малітвай за ўсіх дзяцей

**Столькі дзятвы ў мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы збіраецца аднойчы ў год — кожны раз у святочныя дні Раства Хрыстова. З розных гарадоў і вёсак Беларусі, Расіі, Украіны сёлета прыехалі сюды 450 дзяўчынак і хлопчыкаў.**



Арганізатарамі мерапрыемства па традыцыі сталі грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС МНС Рэспублікі Беларусь, Епархіяльнае ўпраўленне Беларускай Праваслаўнай Царквы. Мэтай праекта, як і раней, стала духоўная, сацыяльная і творчая падтрымка дзяцей і падлеткаў, якія пражываюць у аддаленых і пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы раёнах Беларусі. У галоўным беларускім праваслаўным храме дзяцей чакала сустрэча з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Паўлам.



Гэта сустрэча адбылася згодна з 21-й праграмай «Ёлка Раства — нашы дзеці». Уладыка Павел памаліўся за маленькіх гасцей і блаславіў іх. У храме прагучалі спевы ў выкананні дзіцячага хору сабора, студэнткі Белдзяржкансерваторыі, удзельніцы шматлікіх дабрачынных праектаў БРСМ Ангеліны Можар, лаўрэата фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» Анастасіі Купрыянцавай.

У гонар 21-й сустрэчы на святочным каравaі была запалена дваццаць адна свечка. Дзеці выканалі песні і музычныя творы, прысвечаныя светламу святу, расказалі пра сваё жыццё, вучобу. Патрыяршы экзарх, у сваю чаргу, перадаў усім салодкія пачастункі.

Для грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» сёлетняя «Ёлка Раства» стала асабліва значнай. За значны ўклад у грамадзянскае выхаванне і фарміраванне патрыятычнай самасвядомасці моладзі днямі ён быў адзначаны прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

■ На свае вочы

# ЖЫЦЦЁ ПА РАСКЛАДЗЕ,

## або Як перавыхоўваюць дармаедаў у ЛПП

**Карэспандэнт «Звязды» наведаў віцебскі мужчынскі лячэбна-працоўны прафілакторый (ЛПП), дзе ўбачыў, як перавыхоўваюць тых, хто сумленна жыць не хацеў Гэта цяпер, падчас сустрэчы, яны «сціплыя», а на волі вялі сябе па-іншаму. Шмат пілі гарэлкі і віна, не давалі спакойна жыць родным, суседзям...**

### НЕ ЎСІХ ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ ДОМА...

«Праз 1,5 месяца я выйду на волю. Калісьці працаваў электрыкам. А потым кінуў тую працу, перыядычна па дробязях зарабляў грошы. З жонкай у разводзе, дзеці дарослыя. У тым, што сюды трапіў, нікога не вінавачу. Калі скасаваў шлюб, сарваўся і пачаў піць... І пайшло, і паехала. Думаў, што спынюся, але не атрымалася. У дні запою не кантралюю сябе. Выпіваў многа — і вось вынік... Да таго, як сюды трапіць, жыў з мамай у сваім доме. Думаю, што не адмоўлюся ад кадзіравання», — распавёў 45-гадовы Віктар з Салігорска.

Пагадзіўся «адкрыць душу» і малады мінчанін Дзіма: «У ЛПП трапіў тры месяцы таму, пасля таго, як скончыў вучылішча. Па спецыяльнасці я муляр. Упершыню алкаголь пакаштаваў яшчэ ў 6 класе, калі мама жывая была... Тата быў аматарам выпіць. Ён запрашаў дамоў сяброў, і яны пілі. І мне налівалі. Ад алкаголю тата і памёр. Я нармальна зарабляў на будоўлі. Але аднойчы, калі быў вельмі п'яным, выпаў з акна трэцяга паверха. Яшчэ пашанцавала, што калекам не застаўся. А мог жа і загінуць. Сястра ў бацькоўскай кватэры разам з мужам і дзецьмі жыве. Цяпер адназначна зразумеў, што дрэнна піць. Яшчэ і таму, што трэба быць станоўчым прыкладам для пляменнікаў».

### АКУПЛЯЮЦЬ СВАЁ ЗНАХОДЖАННЕ

Некалькі разоў затрымалі на вуліцы ў нецвярозым стане, скандаліў дома, і міліцыя гэта зафіксавала — дадзеных фактаў дастаткова, каб апынуцца ва ўстанове закрытага тыпу. Дарэчы, у Віцебскай вобласці — тры ЛПП: два — у Віцебску і адзін — у Наваполацку.

У прыватнасці, у ЛПП-4 сёння ўтрымліваецца каля 460 мужчын ва ўзросце ад 20 да 59 гадоў з усіх абласцей Беларусі. Нямала сярод іх людзей, якія раней не мелі праблем з законам, але пачалі злоўжываць алкаголем, не хацелі працаваць. Зараз сярод іншых перавыхоўваюць урача, а раней — выкладчыка ўніверсітэта. Так «даставаў» ён сваю жонку, што ў выніку трапіў у ЛПП...

У прафілакторыі жыццё па раскладзе. У працоўныя дні пад'ём — а 6-й гадзіне раніцы, адбой — у 22.00. У выхадныя і святочныя дні ўстаюць і прачынаюцца на гадзіну пазней. Спяць у пакоях, якія нагадваюць казармы, толькі меншыя па памеры. Ложкі, як у арміі, у два ўзроўні.

На працу мужчын возяць на аўто прадпрыемстваў. Яны працуюць на будоўлі, прадпрыемствах, дзе вырабляюць цэглу, у калгасе... А некаторыя — у майстэрнях прафілакторыя, дзе вырабляюць катушкі для дроту, паддоны.

Заробак розны, пачынаючы ад 2 мільёнаў рублёў у месяц. Пры гэтым, толькі чвэрць пералічваецца на асабістыя рахункі мужчын, а астатняе — кампенсацыя дзяржаве выдаткаў на ўтрыманне ў прафілакторыі. Таму тыя, каго перавыхоўваюць, поўнасцю акупляюць сваё знаходжанне тут і лячэнне. Больш за 60 чалавек абавязаны кампенсаваць выдаткі на ўтрыманне ўласных дзяцей у інтэрнатах.

### САМІ ПРОСЯЦЬ ЗНОЎ ІХ «ЗАШЫЦЬ»

Намеснік начальніка ЛПП-4 па лячэбна-прафілактычнай працы, галоўны ўрач Эдуард Астахаў расказаў, што галоўнае лячэнне — ізаляцыя ад алкаголю, кампаній, у якіх бавілі час. Усе без выключэння грамадзяне адразу трапляюць у медыцынскі стацыянар, што неафіцыйна называецца каранцінам.



Грамадзяне, якія перавыхоўваюцца ў прафілакторыі.

Там на працягу двух тыдняў іх абследуюць псіхіятр, тэрапеўт, неўролаг, якія ставяць дыягназ. Хоць большасць, вядома, трапляе ў прафілакторый з хранічным алкагалізмам. Але стадыі гэтай хваробы розныя. У многіх сустракаецца нават букет захворванняў. Напрыклад, панкрэатыт, гастрыт, цукровы дыябет...

Паводле слоў галоўнага ўрача, за час знаходжання ў ЛПП пацыенты праходзяць чатыры курсы лячэння. І не толькі медыкаментознага. З імі працуе псіхіятр.

— Кадзіраванне — справа добраахвотная. Робіцца яно ў цэнтры наркалогіі пры жаданні мужчын прыкладна за 1—1,5 месяца да таго, як яны выйдуць на волю. Самі пацыенты прызнаюцца, што кадзіраванне — вельмі эфектыўная рэч. Некаторыя, калі зрываюцца, просяць іх «зашыць» зноў. У нас знаходзяцца і чатыры мужчыны, залежныя ад наркотыкаў, — расказаў Эдуард Астахаў.

Лечаць і словам — добраахвотнікі з праваслаўнага брацтва. У ЛПП ёсць малебны пакой, памяшканні для настольных гульняў (акрамя картаў), па раскладзе можна паглядзець тэлевізар.

У краме ЛПП прадаюць харчовыя і нехарчовыя тавары. Цэны — на ўзроўні гарадскіх.

— Крама працуе пяць дзён на тыдзень у дзве змены. У пакупнікоў ёсць асабістыя карткі, якія яны нам паказваюць. У бухгалтэрыі нам выдаюць ведамасці, дзе напісана, колькі грошай мужчына можа патраціць. Цыгарэты, гарбата, кава, печыва, цукеркі — самыя прадаваемыя тавары. Яшчэ купляюць бялізну, ручнікі, пральны парашок, прадметы асабістай гігіены, паштоўкі, шашкі, — расказвае Аксана Далгіцкая, прадавец крамы ЛПП-4.

### НЕ ЎСЕ ВЕРАЦЬ У «ЦУД»

Мужчыны, калі не парушаюць рэжым, маюць права штодня бачыцца са сваякамі. У прафілакторыі ёсць пакой для спатканняў. Раз на месяц дазваляецца доўгачасовае спатканне — да 3 сутак. У пакоі, як у танным гатэлі, даволі ўтульна. І кухарыць можна, і паглядзець тэлевізар... Цікава, што тут нават вяселлі спраўляюць.

Калі «пацыенты» выпраўляюцца, яны маюць права на ўмоўна-датэрміновае вызваленне. Але не ўсіх хочуць бачыць дома. Некаторыя сваякі просяць раней не вызваляць, каб не перашкаджалі спакойна жыць! Не вераць яны ў «цуд» — у тое, што за менш як год рэальна змяніцца ў лепшы бок...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Могилевтранс» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

**по продаже здания административно-хозяйственного,**

**общей площадью 712,4 кв.м, инвентарный номер 700/С-55906, расположенного по адресу: г. Могилев, ш. Гомельское, 5.**

**Начальная цена с НДС – 2 774 121 600 бел. руб.**

**Земельный участок** пл. **0,1256 га** под застройкой предоставляется продавцу в аренду сроком до 19 декабря 2064 года для содержания и обслуживания административно-хозяйственного здания.

*Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».*

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.11.2014 г.*

Аукцион состоится **11.02.2015 в 12.00** по адресу: г. Могилев, Гомельское шоссе, д. 5 (актовый зал).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.02.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**



## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении 18 февраля 2015 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | Квартира трехкомнатная площадью 72 кв.м, лоджия 6 кв.м. инв. № 600/С-135464, 600/D-73305, 2011 г. постройки, расположенная по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, а.г. Новый Двор, ул. Счастливая, д. 5, кв. 21 | 765 367 000 | 76 536 000 |
| 2. | Квартира однокомнатная площадью 40,2 кв.м, лоджия 3,4 кв.м. инв. № 600/С-135464, 600/D-73303, 2011 г. постройки, расположенная по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, а.г. Новый Двор, ул. Счастливая, д. 5, кв. 14 | 573 902 000 | 57 390 000 |
| 3. | Квартира однокомнатная площадью 39,7 кв.м, лоджия 3,3 кв.м. инв. № 600/С-135464, 600/D-73302, 2011 г. постройки, расположенная по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, а.г. Новый Двор, ул. Счастливая, д. 5, кв. 6 | 568 583 000 | 56 858 000 |
| 4. | Квартира трехкомнатная площадью 66,5 кв.м, 1990 г. постройки, инв. № 600/D-35649, расположенная по адресу: Минская обл., Минский р-н, г.п. Мачулищи, ул. Гвардейская, д. 2, кв. 40 | 702 675 000 | 70 267 000 |

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22 |
| **Балансодержатель** | СП «Унибокс» СП |
| **Обременение** | Имущество обременено договорами найма жилого помещения частного жилищного фонда юридического лица |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **18 февраля 2015 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 14.01.2015 по 13.02.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

# АБ'ЯДНАНЫЯ ПЕСНЯЙ

## ЦІ ПАТРЭБНЫ ГРОШЫ, КАЛІ НАСТРОЙ ХАРОШЫ?

**Ансамбль народнай музыкі «Радуніца» — першы ў Гомельскай вобласці калектыў, які пачаў працаваць у змешаным жанры (калі спалучаюцца песні, танцы і ігра на розных інструментах). Ён створаны групай аматараў беларускага фальклору пры раённым Доме культуры ў сакавіку 1989 года. Яго мастацкі кіраўнік — чалавек з творчай душой і сэрцам, поўнымі любові да роднага песеннага, музычнага і танцавальнага мастацтва. Чым жа парадавалі самадзейныя артысты здымачную групу праекта «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3»?**





Мы з творчай камандай тэлевізійнікаў завіталі ў аграгарадок Козенкі, што ў Мазырскім раёне. Ёсць некалькі версій узнікнення населенага пункта і яго назвы. Лічыцца, што ў аснове назвы мясцовасці ляжыць слова «каза» альбо прозвішча з такім коранем, вельмі распаўсюджанае на Мазыршчыне. Існуе яшчэ легенда, паводле якой першым тут з'явіўся селянін Кузьма Козенка. Ён жыў на хутары, потым побач з ім пачалі сяліцца іншыя людзі, і месца атрымала такую назву. А ёсць і больш паэтычная легенда ўзнікнення назвы Козенак. Яна расказвае пра тое, як некалі на гэтым месцы працякала невялічкая рэчка (прыток рэк Тур і Прыпяць), на яе берагах рос густы лес. Там пасвіліся дзікія козы, з якімі на беразе ракі любіла бавіць час маленькая дачушка першых пасяленцаў, ласкава называючы іх «козенькі». Аднойчы дзяўчынка патанула ў вірлівых водах, яе маці пракляла рэчку, і тая высахла. Бацькі ж яшчэ доўга чулі, нібыта іх дачушка клікала: «Козенькі, козенькі»...

— Гэта цяпер у нас вуліцы называюцца Спартыўная, Гагарына і гэтак далей, а раней Козенкі былі падзелены на хутары. Яны называліся Кавалі (там жыў каваль), Сюські, Кунгеры (гэта карэнныя прозвішчы, вельмі распаўсюджаныя тут), Леснікі, Мурог (там былі хаты і прасторны луг). Яшчэ з дзяцінства памятаю, як маці казала: «Я пайшла на Кавалі!» — успамінае мясцовая жыхарка Ніна Рудзько. — Раней былі вялікія сем'і, людзі пасвавалі і на зямлі працаваць, і гаспадарку трымаць, і дзяцей гадаваць. Хоць і жылі бядней, але жыццё было багатым на ўражанні. Я сама, напрыклад, Каляды вельмі любіла, калі дзеці і дарослыя хадзілі віншаваць аднавяскоўцаў са святам. Прыходзілі ў хату, зычылі дабра, добрага ўраджаю, песні спявалі прыгожыя. І нас частавалі рознымі прысмакамі. А сёння часцей чуеш: «Пятак не грошы, долар хорошы». Атмасфера ўжо не тая, але ж у кожнага часу свае адметнасці.

Падзялілася ўдзельніца калектыву і ўспамінам пра любімую з дзяцінства страву, якая называецца «сыроватка». Прыгатаваць яе вельмі лёгка: варым проса на вадзе або на сыроватцы без солі, а перад падачай на стол дабаўляем смятану.

Час пераходзіць ад успамінаў да таго, што адбываецца на сцэне, дзе ўжо якраз усе артысты сабраліся...

Як толькі пачалі іграць уступ да першай песні і загучалі бубен, гармонік і барабан, адразу з'явілася жаданне ўсміхацца і рухацца ў такт музыцы. Са сцэны гучаць пажаданні дабрабыту, здароўя і шчасця — і робіцца так цёпла на душы, што хочацца працягу...

*Сонейка заходзіць,*
*У вокны паглядае.*
*Паўлюк на Ганулю*
*Скоса пазірае.*
*Ох, доля мая,*
*Сіні вочы твае.*
*Як цябе не бачу,*
*Баліць сэрца мае.*
*Як тая цяцера,*
*Што лятаць ня хоча,*
*Гэтак маё сэрца*
*За табой лякоча.*
*Як тыя калёсы,*
*Што рыпяць без мазі,*
*Я да цябе прыліп,*
*Як свіння да гразі.*
*Ой высах жа, высах,*
*Як лапаць на печы,*
*А ты мне ўсё кажаш,*
*Што я недарэчы.*
*Куплю табе цэбар,*
*Пастаўлю ля хаты,*
*Хай табе напомніць,*
*Што я не жанаты.*

— У 1988 годзе я пераехаў працаваць у раённы Дом культуры. Перад гэтым супрацоўнічаў з многімі калектывамі, тады былі папулярнымі ансамблі песні і танца. І тут з'явілася ідэя стварыць нешта змешанае, дзе б людзі і спявалі, і танцавалі, і гралі на інструментах. Так з'явіўся наш калектыў, — расказвае пра «Радуніцу» яе мастацкі кіраўнік Мікалай Туравец.

Ансамбль народнай музыкі — адзін з найбольш яркіх і арыгінальных аматарскіх калектываў Мазыршчыны і па творчым складзе артыстаў, і па сваім рэпертуары. Шмат часу, акрамя канцэртнай дзейнасці, гэтыя артысты аддаюць пошуку і збору песеннага матэрыялу і краязнаўчай работы. Так, напрыклад, удзельнікамі ансамбля падчас фальклорных экспедыцый па Мазыршчыне было запісана больш за трыста народных песень, жартаў, прымавак, якія набываюць новае жыццё на сцэне. Сёння ў рэпертуары ансамбля больш за 60 песень і 20 розных танцаў. Баян, гармонік, кантрабас, флейта, дудка заўсёды гучаць зладжана і прафесійна. А дадайце сюды танцы і жывое гучанне галасоў — ці можна прыдумаць штосьці лепшае, калі хочацца атрымаць асалоду ад народнай песні? Тут і вока, і слых радуюцца.

*Ой, на горцы, на пясочку,*
*Рыда-рыду-рай-рай.*
*Ой на горцы на пясочку,*
*Рыда-рыду-рай-рай.*
*Там пасеяў Раман грэчку,*
*Ой-яй-яй.*
*Ані грэчкі, ні паловы,*
*Рыда-рыду-рай-рай.*
*Ані грэчкі ні паловы,*
*Рыда-рыду-рай-рай.*
*Ў Кацярыны чорны бровы,*
*Ой-яй-яй.*
*Ой, там Раман валы пасе,*
*Рыда-рыду-рай-рай.*
*Кацярына ваду нясе,*
*Ой-яй-яй.*
*Раман русы, я бялява,*
*Рыда-рыду-рай-рай.*
*Вельмі добра будзе пара,*
*Ой-яй-яй...»*



У складзе аматарскага калектыву на 15 чалавек ва ўзросце ад 18 да 64 гадоў. І кожны з іх добра танцуе, спявае і грае на інструменце. Старажылам калектыву тут лічыцца Анатоль Кліменка:

— Старэйшыя людзі кажуць, што я, як быў маленькі, калі бацька іграў на гармоніку, дапамагаў яму, стукаючы па барабане. І вось ужо 60 гадоў я на сцэне. Люблю беларускую песню. Быў маладзейшы, дык рыхтаваў калектывы Мазыра на агляды і розныя конкурсы. А цяпер у ансамблі, дзе заўсёды весела, і спяваем, галоўнае, ужываю. Людзі гэта адчуваюць і рэагуюць, — кажа Анатоль Уладзіміравіч, вядомы яшчэ і тым, што ўмее дэманстраваць салаўіны спеў. Гэтым нумарам ён заваёўваў не раз самую разнастайную публіку, у тым ліку журы рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў...

*Ажаніўся стары дзед,*
*Узяў ён дзеўку дваццаць лет,*
*Ой-да, ой-да, ой-да-да...*
*Калі клаліся ўжо спаць,*
*а старога не відаць,*
*Ой-да, ой-да, ой-да-да...*
*Азіраецца дзед з печы:*
*— Я пагрэю сабе плечы.*
*Ой-да, ой-да, ой-да-да...*
*— Каля печы грэй ты спіну,*
*а я выйду на хвіліну,*
*Ой-да, ой-да, ой-да-да...*
*Цалаваліся на ганку,*
*дзед на печы спаў да ранку.*
*Ой-да, ой-да, ой-да-да...*
*Нашто дзеду маладзіца,*
*Яму і так на печы спіцца,*
*Ой-да, ой-да, ой-да-да.*

Візітнай карткай ансамбля з'яўляецца ўвасабленне душы беларускага народа ў песні, музыцы і танцах. Яго ўдзельнікі здольны здзіўляць сваім запалам, талентам і жыццярадаснасцю з кожным гледачом, незалежна ад таго, выступаюць яны ў зале, для некалькіх тысяч альбо на пляцоўцы для некалькіх чалавек...

— Мы ўсе як сям'я ў калектыве. Узрост розны, але аб'ядналі песні. Нашы гледачы таксама розных узростаў, і нам падабаецца, што мы запатрабаваны рознай публікай. Выступаем з задавальненнем і поўнай аддачай і на вялікіх сцэнах, і ў маленькіх вёсках. Аднойчы нейкая бабуля сказала нам: «Я цяпер ведаю, чаму не памерла — мне трэба было ваша выступленне ўбачыць». Гэта лепшая ўзнагарода для нас як для артыстаў, — прызнаўся Мікалай Туравец.

Хочацца пажадаць ансамблю «Радуніца» і яго ўдзельнікам яшчэ не адзін год радаваць людзей, знаходзіць новы матэрыял і не страчваць умення кранаць песняй душу.

**Алена ДРАПКО.**

## МАЛАДОСЦЬ ДУШЫ Ў «СПАДЧЫНЕ»

**Новы год ужо распачаўся, а з ім — і фальклорныя вандроўкі ў кампаніі праграмы «Наперад у мінулае». Калі вам не ўдалося паглядзець выпуск любімай праграмы 4 студзеня, то ў бліжэйшую нядзелю, 11 студзеня, будзе магчымасць убачыць паўтор. Пачуць таленавітых людзей з вёскі Вуглы Калінкавіцкага раёна — калектыў «Спадчына» — і даведацца, які выбар зробіць госць праграмы Алена ГРЫШАНАВА.**



Напрыклад, чым адметная фальклорная творчасць у вёсцы Вуглы. Дарэчы, сама вёска па пісьмовых крыніцах вядомая з XVIII стагоддзя і не выпадкова носіць такую назву. Некалі тут людзі будаваліся сем'ямі, куточкамі. Тым самым займалі той ці іншы вугал, а вуліцы ад гэтага атрымлівалі вуглаватымі. Вось і далі адпаведную назву паселішчу. Сёння гэта маленькая вёска, дзе жывуць людзі з прыгожымі галасамі, якія могуць не толькі паспяваць, але і жыццёвым гісторыямі падзяліцца. Калектыў «Спадчына» ўзнік пры аматарскім аб'яднанні, арганізаваным у клубе суседняй вёскі Беразнякі ў 1995 годзе. Самай старэйшай удзельніцы калектыву 85 гадоў — пагадзіцеся, не кожны можа ў такім паважаным узросце захаваць маладосць душы. Песні ўсе запісаны «ад людзей», ад жывых носьбітаў. Мясцовыя бабулі расказваюць, што песня заўсёды суправаджала і дапамагала па жыцці: з ёю і немаўля купалі, і жыта жалі, і Купалле святкавалі, і каравай на вяселле выпякалі. Тэмы таксама розныя: вясёлыя, жартоўныя, а сустракаюцца і сумныя. Перадавалі любоў да песні з пакалення ў пакаленне. Так і захоўваюцца да сёння набыткі песеннай культуры. На Каляды людзі самі збіраюцца, пераапранаюцца і віншуюць іншых. І моладзь, і дзеці маюць магчымасць бачыць і далучацца. Таму вы не губляйце магчымасць пазнаёміцца з гэтым таленавітым калектывам, уключайце «Беларусь 3» 11 студзеня ў 11.55.

А праз тыдзень вас чакае сустрэча і знаёмства з ансамблем «Радуніца» з аграгарадка Козенкі, удзельнікі якога будуць весяліць, дэманструючы ўласныя таленты ў песнях і танцах. А потым прадставіць сваю кавер-версію песні з рэпертуару спевака Аляксандра Патліса. Таксама даведаецеся з праграмы пра мясцовыя легенды і паданні. Словам, падарожжа вас не расчаруе. Трэба толькі не забыцца пра эфір праграмы ў нядзелю, 18 студзеня, усё на тым жа канале.




# НАВАСТРЫЦЕ ВУШЫ І ТАНЦУЙЦЕ АД ПЕЧЫ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды».**

**Ці ведалі вы, што:**

**Гу́тнік** — рабочы, які вырабляў шкло.

**Ва́бік** — свісток для падзывання птушак і звяроў.

**Вэ́рхал** — вялікі беспарадак, крык, шум.

**Ёўня** — збудаванне для сушкі снапоў.

**Абе́руч** — абедзвюма рукамі (напрыклад, узяць).

**Бяспе́чна** — калі нішто не пагражае.

**Танцаваць ад печы** — пачынаць з самага пачатку, з самага прывычнага. Яшчэ кажуць «пачынаць ад яйца», а па-руску — начинать с азов.

**Навастрыць вушы** — уважліва прыслухоўвацца, насцярожвацца, быць пільным, наставіць вушы, натапырыць вушы, рускі аналаг — «быть начеку». Фразеалагізм «навастрыць вушы» ўзяты з жывёльнага свету. Узнік як вынік пераносу на чалавека ўласцівасцяў жывёлы. Згадайце сабаку ці каня: яны, адчуўшы небяспеку, заўсёды настаўляюць вушы і пільна прыслухоўваюцца.

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» ***кожную суботу ў 11.10–11.25.***

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Тэлесеткі

# ПРЫРОСТ У «ГАЛОЎНЫМ ЭФІРЫ»

**З Новага года ў аналітычным праекце канала «Беларусь 1» з'явіўся новы дуэт вядучых — палітычны аглядальнік Агенцтва тэленавін Сяргей Гусачэнка і вядучая навін і праграмы «Панарама» Паліна Шуба.**





Такім чынам, цяпер вынікі тыдня штонядзелю падводзяць па чарзе тры пары вядучых: Дзмітрый Бачкоў і Алена Насачова, Іван Міхайлаў і Вікторыя Сянкевіч і Сяргей Гусачэнка з Палінай Шубай. А вось задачы праекта, запэўніваюць яго стваральнікі, засталіся нязменнымі. «Мы імкнёмся зрабіць своеасаблівы экстракт з самых цікавых падзей мінулага тыдня, пры тым у зразумелай і даступнай для кожнага форме, — падкрэслівае дырэктар Агенцтва тэленавін Кірыл Казакоў. — «Беларусь 1» — класічны грамадска-палітычны канал, і мы не адмаўляемся ад агульнапрынятай формы падачы матэрыялаў, але дадаём і пэўныя навінкі для прыцягнення той часткі аўдыторыі, што «жыве» ў інтэрнэце, хутка думае і атрымлівае інфармацыю з самых розных крыніц».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# ПАНЯДЗЕЛАК, 12 СТУДЗЕНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.45 Камедыя «Новы стары дом». 1-я серыя.**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10** «Зорнае жыццё». «Татыадзіночкі».
**13.15, 15.25 Меладрама «Школа для таўстушак». 1-я і 2-я серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.25** Нашы.
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.30** Актуальнае інтэрв'ю.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.05, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Серыял «Сашка».**
**10.35** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.35 Дэтэктыў «Сустрэчная плынь».**
**13.20 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**15.40** «Comedy Батл». Без межаў».
**17.50 Серыял «Таксі».**
**18.50 Серыял «Універ».**
**20.45** Мазгавы штурм.
**21.25** КЕНО.
**21.30 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**22.25 Дэтэктыў «Выпадковы сведка». 1-я серыя.**
**23.20** Хачу ў тэлевізар!
**23.25** «Халі-галі». Скетч-шоу.

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50, 17.50** «Дыя@блог P.S.».
**8.15 «Пасажыр пад дажджом». Драма.**



**10.10** «Гучанне жыцця». Жыццё і творчасць народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна.
**11.05 «Тапінамбуры». Дзіцячы фільм.**
**13.15, 19.35** «Размаўляем па-беларуску».
**13.20 «Дзень добры і бывай!». Меладрама.**
**14.55** «Маладзечна-2014». «Спадчына «Песняроў».
**16.20 «Гэта вясёлая планета». Камедыя.**
**18.15 «Як выйсці замуж за караля». Фільм-казка.**
**19.40 «Ясь і Яніна». Камедыя.**
**20.45** «Калыханка».
**21.05** «Песні навагодніх начэй». Выпуск сёмы. 90-я гады.
**21.30** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**22.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**22.50** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Юры Несцярэнка.

## БЕЛАРУСЬ 5

**4.00, 7.30, 15.25, 21.20** Тэніс. Турнір ВТА. Сідней.
**7.20, 23.55** PRO спорт. Навіны.
**11.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва» Мінск.
**13.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Саўтгемптан».
**17.30** Хакей. КХЛ. ХК «Сочы» — «Дынама» (Мінск).
**19.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Аберхоф. Масстарт. Жанчыны.
**20.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Балабон».**
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Сёння вечарам».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «ЗАГС».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Камедыя «Каханне з перашкодамі».**
**0.10** «Палёт у Новы год».
**2.00** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 13.50, 16.50** «Гарады, якія спяваюць».
**10.45, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.55** «Вялікі горад».
**14.35** «Ежа багоў».
**15.40** Іншая краіна. «Казахстан. Дзе юрты суседнічаюць з хмарачосамі».
**16.55** «Далёкія сваякі».
**18.30** «Скрытая пагроза»: «Грозны час».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тыдзень спорту».
**23.30** «Дзіўная справа».
**0.20 Серыял «Зграя».**

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30, 1.40 Маст. фільм «Чалавек-невідзімка».**
**11.05 Маст. фільм «Дыягназ: каханне».**
**12.30** «За сталом з правадырамі».
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 4.10 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 3.15 Серыял «У свеце ежы».**
**16.25, 0.45** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.20 Серыял «Доктар Тырса».**
**19.25 Маст. фільм «На месце».**
**21.10, 23.10 Серыял «Метад Лаўровай».**
**0.05** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**0.15** «Наша марка».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.05** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Загадкі цывілізацыі. Руская версія». Фільм 1-ы. «Гіпербарэя. Страчаны рай».
**16.40** «Касманаўтыка».
**17.15** «Уся Расія».
**18.00 Серыял «Сэрца зоркі».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.40 Серыял «Бедныя сваякі».**
**21.40, 23.15 Серыял «Веру не веру».**
**0.30** «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.30** «Справа ўрачоў».
**9.25, 10.35 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.20** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** «Ядзім дома».
**14.50** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Пракурорская праверка».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Павуцінне».**
**23.30 Серыял «Кляймо».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 13.25, 19.40, 20.55, 23.35** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30** «Сёння клюе».
**8.00 Камедыя «Закахацца ў нявесту брата».**
**9.40 Серыял «Айцец Браўн».**



**10.30** «Кінаблакнот».
**11.00 Прыгоды «Выжыць».**
**13.30 Серыял «Чарцяня».**
**15.15, 19.25** «Тэлемагазін».
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00 Серыял «Незабыўныя Каляды».**
**17.35 Серыял «Эўрыка».**
**18.30 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».**
**19.45 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Гульні патрыётаў».**
**23.10 Серыял «Прыгарад».**

## ВТБ

**6.00, 3.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** Меладрама «Апошняя справа Казановы».
**11.00, 16.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**12.00** Трылер «Лепшая прапанова».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00, 23.10** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**18.00** Серыял «Кухня».
**19.00** Серыял «Думай як жанчына».
**21.10** Меладрама «Мой першы раз».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

## КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.10** «Лінія жыцця». Яўгенія Дабравольская.
**13.05, 17.55, 2.35** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.20** «Пяць вечароў». Маст. фільм.
**15.10** «Міхаіл Лермантаў. Таямнічая аповесць». 1-я серыя.
**15.40** «Уладар гіраскопаў». Аляксандр Ішлінскі». Дак. фільм.
**16.20** «Утаймаванне каня. Пётр Клод». Дак. фільм.
**17.00** Дзмітрый Корчак. Рускія народныя песні.
**18.10** «Паліглот». Партугальская з нуля за 16 гадзін! № 1.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Саці. Нясумная класіка...».
**20.10** «Правілы жыцця».
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** 95 гадоў з дня нараджэння Сямёна Лунгіна. «Астравы».
**21.30** «Тым часам».
**22.15** Прыступкі цывілізацыі. «Скрозь кратовую нару з Морганам Фрыменам». Дак. серыял.
**23.00** «Халстамер. Гісторыя каня». Дак. фільм.
**23.50** «Кінескоп». Прэмія Еўрапейскай акадэміі кіно.
**0.30** Дакументальная камера. «Андрэй Герасімаў: дыялог з самім сабой».
**1.10** Бела Бартак. Канцэрт № 1 для фартэпіяна з аркестрам.
**1.40** «Пецярбургскія тайны». Серыял.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Вясёлыя ноткі. На бале ў Папялушкі». 1991 год.
**7.15, 12.50** «Выкраданне». Навагодні фільм-канцэрт. 1969 год.
**8.50** «Навагодні атракцыён». Канцэрт артыстаў эстрады ў цырку на Ленінскіх гарах. 1-я частка. 1984 год.
**10.20, 15.55** Маст. фільм «Начныя забавы».
**11.35, 18.40, 20.35, 2.35** Канцэрт замежнай эстрады.
**12.00** Паштовае аддзяленне «Блакітнага агеньчыка». Навагодні выпуск. 1966 год.
**14.25** «Навагодні атракцыён». 1984 год.
**17.00** «Праграма А». Навагодні спецвыпуск: «Ноч кашмараў». 1990 год.
**18.00** «Да 16 і старэйшым». 1992 год.
**19.00** «Прэс-экспрэс».
**19.15** «Гэты фантастычны свет». Тэлеспектакль «Псіхадыямагніка вядзьмарства». 1990 год.
**21.00** Праграма «Час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**23.00** «Песня-85». 1-я частка.
**0.00** «КВЗ-90». Навагодні выпуск.
**0.50** «Навагодняя забаўляльная праграма».
**1.30** Маст. фільм «Саламяны капялюшык». 2-я серыя.
**2.55** «Навагодняе святочнае прадстаўленне». 2-я частка. 1987 год.
**4.00** «Колба часу». «Любімая савецкая песня пра зіму».
**5.00** «Шырэй круг». Навагодняя праграма. 2-я частка. 1987 год.

## EUROSPORT

**3.00, 11.00, 21.55, 1.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар.
**10.30** Ралі. Ралі рэйд.
**10.45, 1.30** WATTS.
**11.30** Тэніс. Выставачны матч. Р. Федэрэр (Швейцарыя).
**13.30** Біятлон. Кубак свету.
**14.30, 16.00, 22.00** Снукер. Мастэрс.
**15.30** All Sports.
**19.00, 1.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**20.00, 2.30** Футбол. Еўрагалы.
**20.30** Футбол. Цырымонія ўручэння Залатога мяча ФІФА.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 14.30, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Сваты 3».
**6.50** Камедыя «Свята пад замком».
**8.10, 12.30, 14.10, 19.45, 21.40, 22.50, 0.45, 2.50, 5.25** Скетчком «Паміж намі».
**8.25** Камедыя «Калядная пячорка».
**10.55** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**12.45** Камедыя «Я буду дома да Каляд».
**15.25** Мюзікл «Светлыя Каляды».
**18.25** Камедыя «Чалавек-эльф».
**20.20** Камедыя «Зануда».
**23.10** Меладрама «Пакуль ты спаў».
**1.20** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**4.05** Меладрама «Каханне ў вялікім горадзе».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.25, 18.55, 1.55** Серыял «Каханне і пакаранне».
**9.50, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.35, 18.00** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.30** «Сто пытанняў даросламу».
**13.20** Серыял «Аўрора».
**14.10** «Жонка. Гісторыя кахання».
**15.30, 22.40, 3.20** «Зорныя гісторыі».
**16.30** «Шчырая размова».
**17.30, 4.00** «Простыя складанасці».
**20.35** Серыял «Шулер».
**21.40, 1.05** Серыял «Брыгада».
**23.25** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**0.10** «Часова даступны».

## ТБ1000

**6.30** Фэнтэзі «Змярканне. Сага. Світанак: Частка 1».
**8.45** Фэнтэзі «Змярканне. Сага. Світанак: Частка 2».
**10.45, 4.30** Драма «Рэйчэл выходзіць замуж».
**12.45, 2.30** Дэтэктыў «Адзінаццаць сябровў Оўшэна».
**14.45** Камедыя «Добры хлопец».
**16.30** Меладрама «Бяспека не гарантуецца».
**18.00** Камедыя «Сем псіхапатаў».
**20.00** Фантастыка «Галодныя гульні».
**22.30** Драма «Самая п'яная акруга ў свеце».
**0.30** Драма «Кароль гаворыць!».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Прыгоды «Краіна добрых дзетак».
**8.20** Фантастыка «Рэжым поўнага апускання».
**10.20** Меладрама «Паралельныя светы».
**12.00** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**14.50** Меладрама «Вечнае вяртанне».
**16.50** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**18.30** Камедыя «Ёлкі 3».
**20.20** Баявік «Васьмёрка».
**22.00** Драма «Агні прытона».
**0.00** Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
**2.10** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
**4.20** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**6.40** Гульні розуму.
**7.10** Займальная навука.
**7.30, 13.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50, 12.40** Зрабі або памры.
**8.10, 19.30** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**9.40, 14.10, 14.10, 18.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**11.10** Машыны: разабраць і прадаць.
**12.00, 18.40** Скарбашукальнікі.
**15.45** Выратаваны львіцай.
**16.30** Экстрэмальная падарожка.
**17.10** Космас: прамы эфір.
**21.00, 0.45, 3.45** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**21.45, 1.30, 4.30** Расследаванні авіякатастроф.
**22.30, 5.15** Непаранармальная канструкцыі.
**23.10** 80-я: дзесяцігоддзе, якое зрабіла нас.
**0.00, 2.20** Паранармальнае.
**3.00** Апакаліпсіс: Першая сусветная вайна.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Трой.
**9.40, 13.50** У пагоні за класікай.
**12.10, 18.00** Каралі аўкцыёнаў.
**13.00, 7.05** Золата джунгляў.
**14.40, 6.05** Як мы вынайшлі свет.
**16.20, 4.25** Хуткія і гучныя.
**17.10, 5.15** Махінатары.
**18.50** Як пабудаваць суперкар.
**19.40** Скануючы неба: тэлескоп Discovery Channel.
**20.30** Эфект Карбанара.
**22.10** Голыя і напалоханыя.
**23.00** Анаконда.
**0.40, 3.35** Паляўнічыя на рэлівіі.
**1.30** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

# АЎТОРАК, 13 СТУДЗЕНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.30 Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
**11.05 Камедыя «Новы стары дом». 2-я серыя.**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «На шляху да сэрца». Заключная серыя.**
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.35 Серыял «Сваты 5».**
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
**20.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць». 1-я серыя.**
21.00 Панарама.
0.25 Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Серыял «Сашка».**
10.10 «Fitnews».
**10.45, 21.35 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**11.40, 22.30 Дэтэктыў «Выпадковы сведка».**
12.40 Ікра.
**13.35, 18.50 Серыял «Універ».**
15.40 «Comedy woman».
**17.50, 23.30 Серыял «Таксі».**
20.50 Мазгавы штурм.
21.25 Спортлато 6 з 49.
21.30 КЕНО.
23.25 Хачу ў тэлевізар!
0.25 «Халі-галі». Скетч-шоу.

## БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 16.40 «Эпоха». Паэт, публіцыст, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху Адам Міцкевіч.
8.55 «Песні навагодніх начэй». Выпуск сёмы. 90-я гады.
**9.20 «Ясь і Яніна». Камедыя.**
10.25 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
11.15 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Юры Несцярэнка.
11.55 «Размаўляем па-беларуску».
12.00 «Энергія руху». Стварэнне паліўна-змазачных матэрыялаў для ваеннай прамысловасці.
12.15 Прэм'ера. «Святло далёкай зоркі». Памяці кінарэжысёра Віталя Чацвярыкова.
**12.45 «Памылка інжынера Кочына». Дэтэктыў.**
14.25 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
14.55 «Навагодні вечары ў Маладзечне». Зімовы калейдаскоп.
**16.00 «Бусляня». Кароткаметражны фільм.**
17.30 «Русь былінная». Канцэрт казацкага ансамбля «Атаман».
**19.10 «Яўгенія Грандэ». Меладрама.**
20.45 Калыханка.
21.05 «Песні навагодніх начэй». Выпуск восьмы. 2000-я гады.
**21.35 «Пяшчотная зіма». Меладрама. 1-я і 2-я серыі**
23.15 «Сто песень для Беларусі». Навагодняя ноч. Часткі 1-я 2-я.

## БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 0.25 PRO спорт. Навіны.
7.30, 16.00, 21.25 Тэніс. Турнір ВТА. Сідней.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
18.05 Спорт-кадр.
18.35 Авертайм. КХЛ.
18.55 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Масква).
23.30 Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Балабон».**
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Сёння вечарам».
16.50 «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «ЗАГС».**
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
**21.05 Серыял «Кат».**
23.15 «Стары Новы год».
1.50 Начныя навіны.

## СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.55, 22.00 «Глядзець усім!».
9.10 «Тыдзень спорту».
9.40 «Такі лёс».
10.40, 13.50, 16.50 «Гарады, якія спяваюць».
10.45, 17.30 «Званая вячэра».
11.40 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
**13.55 Камедыя «Мае блакітныя нябёсы».**
15.40 «Татальны распродаж».
16.55 «Далёкія сваякі».
18.30 «Скрытая пагроза»: «Тэхнарабства».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Выпадковы раман».**
23.00 «Разумней не прыдумаеш».
0.00 «Аўтапанарама».
**0.20 Серыял «Зграя».**

## МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
**9.30, 3.25 Маст. фільм «Сто грамаў «для хрvärlden»**

# МАНДАРЫНЫ: КАРЫСЦЬ І ШКОДА

**У Старажытным Кітаі гэтыя плады былі на вагу золата і лічыліся раскошай, таму іх маглі дазволіць сабе толькі імператары — мандарыны, у гонар якіх і назвалі плод.**



Усходнія лекары з даўніх часоў выкарыстоўвалі іх для лячэння бранхіяльнай астмы, цынгі, атлусцення і іншых захворванняў. У гэтых сонечных пладах змяшчаецца велізарная доза вітаміну С і D, а з-за вітаміну K, які ўмацоўвае сценкі крывяносных сасудаў, мандарыны рэкамендуюцца гіпертонікам і сардэчнікам. Акрамя таго, заморскія плады дабратворна ўплываюць на лёгкія і бронхі, паляпшаюць вастрыню зроку, зніжаюць узровень цукру ў крыві, памяншаюць ацёкі і з'яўляюцца выдатным сродкам супраць паразітаў. Акрамя карысных уласцівасцяў, мандарыны маюць і некаторыя супрацьпаказанні — напрыклад, раздражняюць ныркі, слізістую абалонку кішэчніка і страўніка, таму пры праблемах у гэтых органах ад дэгустацыі мандарынаў лепш устрымацца.

## Якія віды бываюць?

Самыя салодкія плады — Мёд, Робінсан, Храм, Дэнс і Клемянціна (алжырскі гібрыд з апельсінам), Мініёла (гібрыд мандарына і грэйпфрута), ізраільскія і мараканскія сарты. Танжэрыне мае трохі даўкі смак, абхазскія, турэцкія і кітайскія плады вылучаюцца лёгкай кіслінкай. Усе мандарыны маюць лупіну жоўта-аранжавага колеру рознай ступені яркасці, акрамя сорта Мёд — гэтыя плады могуць быць не толькі аранжавымі і жоўтымі, але і зялёнымі, як і філіпінскія мандарыны.

Самыя вялікія мандарыны — Танжэла (гібрыд з грэйпфрутам) і Тангора, яны сваімі памерамі нагадваюць апельсін, самыя маленькія — Клемянціна. Лепш за ўсё лупіцца абхазскія, турэцкія, мараканскія, іспанскія і японскія мандарыны.

## Як правільна выбраць і захоўваць?

Варта купляць толькі непашкоджаныя плады, без плям гнілі, а каб праверыць ступень іх спеласці, дастаткова крыху сціснуць скурку: калі пырснуў сок — значыць, мандарыны спелыя. Пры абмацванні не павінна быць занадта мяккіх участкаў або увагнутасцяў, паколькі гэта з'яўляецца прыкметай таго, што плод пераспеў і пачаў падгніваць.

Рэкамендуецца захоўваць мандарыны ў адсеку халадзільніка для садавіны, бо пры пакаёвай тэмпературы яны хутка псуюцца. Узімку можна размясціць плады на ўцепленым балконе ў скрыні, якая ветраецца, пры ўмове, што тэмпература паветра не ніжэй за 6 градусаў. Важны момант — мандарыны нельга трымаць у поліэтыленавым пакеце, паколькі пры павышанай вільготнасці яны пачынаюць імгненна гніць.

## Што трэба ведаць?

✓ Белая сетачка паміж долькамі, якую часта выдаляюць пры ачыстцы садавіны, багатая на гліказіды, якія ўмацоўваюць сэрца.

✓ У мандарынах змяшчаюцца асаблівыя рэчывы — фітанцыды, якія здымаюць дэпрэсію і паляпшаюць настрой.

✓ Каб падоўжыць тэрмін жыцця мандарынаў, змажце лупіну алеем або воскам, якія закрываюць поры і дзейнічаюць, як кансервант.

✓ Мандарыны не змяшчаюць нітратаў, якія «баяцца» аскарбінавай кіслаты.

# ПЯТНІЦА, 16 СТУДЗЕНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 19.55 Серыял «Выходжу цябе шукаць».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Меладрама «А шчасце дзесьці побач». 3-я серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.30 Серыял «Сваты 5».**
**17.25** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**17.55** Нашы.
**18.10** «Вялікі рэпартаж».
**21.00** Панарама.
**21.45 Фантастыка «Людзі Ікс: Першы клас».**
**0.15** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 14.50 Серыял «Сашка».**
**10.05** Капейка ў капейку.
**10.40 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**11.40 Дэтэктыў «Выпадковы сведка».**
**12.55 Серыял «Універ».**
**15.50 Серыял «Таксі».**
**16.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Спрынт. Жанчыны.
**18.40** Я хачу гэта ўбачыць.
**19.15 Баявік «Фантастычная чацвёрка: Уваранне сярэбранага сёрфера».**
**20.50** Мазгавы штурм.
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Экстрасэнсы вядуць расследаванне». Выпуск 1-ы.
**22.35** Рэпарцёр.
**23.20 Баявік «Слёзы сонца».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 16.10** «Эпоха». Максім Багдановіч — паэт, публіцыст, літаратуразнаўца.
**8.50, 17.00** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**9.20 «З каханымі не разлучайцеся». Меладрама.**
**10.35 «Чэхаўскія матывы». Трагікамедыя.**
**12.35** «Першапраходцы Далёкага Усходу». Дак. фільм «Капітан тайгі. Уладзімір Арсеньеў».
**13.25** «Сіла веры».
**13.55** «Аўтограф». Квартэт баяністаў Гомельскага каледжа мастацтваў імя Сакалоўскага.
**14.20, 17.25** «Размаўляем па-беларуску».
**14.25** «Тайна Трэцяй планеты». М/ф.
**15.10** «Музеі Беларусі». Нацыянальны мастацкі музей Беларусі.
**17.35** «У рэху імені твайго...» Пра жонку Францыска Скарыны Маргарыту Адвернік.
**17.45** «Зімачка». Юбілейны канцэрт, прысвечаны 40-годдзю ансамбля «Харошкі».
**19.25 «Бархан». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.00 «Апошні рэйд». Маст. фільм.**
**23.10** «Камертон». Рэгент Патрыяршага хору Маскоўскага Данілава манастыра Георгій Сафонаў.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 3.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Фактар сілы.
**8.30** Авертайм.
**9.00, 13.40** Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
**11.00** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**11.30, 23.35** Тэніс. Турнір ВТА. Сідней. Фінал.
**15.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Эстафета. Мужчыны.
**16.55, 22.05** Гандбол. Чэмпіянат свету. Іспанія — Беларусь.
**18.30** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. 1-ы этап. 2-я стадыя.
**20.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Спрынт. Жанчыны.
**1.35** Піт-стоп.
**2.05** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.25** «Сёння вечарам».
**16.15 Камедыя «Старыя-разбойнікі».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Тры акорды».
**23.15** «ІльфіПятроў».
**1.05** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Добры дзень, доктар».
**9.35** «Дарагая перадача».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40, 13.50, 16.50** «Гарады, якія спяваюць».
**10.45, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.55 Камедыя «Не выпускай з-пад увагі».**
**15.45** «Татальны распродаж».
**16.55** «Далёкія сваякі».
**18.35** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Тры метры над узроўнем неба».**
**23.00** «На тым жа месцы ў той жа час».
**0.15** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**1.00 Камедыя «Даспехі бога».**

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Сардэчна запрашаем».
**9.30 Маст. фільм «Не было смутку».**
**10.45 Маст. фільм «О'кей».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 4.40 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
16.25 «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Доктар Тырса».**
**19.25 Серыял «Яго каханне».**
**22.50 Маст. фільм «Прага золата».**
**0.30** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**1.10 Маст. фільм «Залезь на Месяц».**
**2.50 Маст. фільм «Светлы шлях».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Прамы эфір».
**12.50** «Асабівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.10** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Рускі след Каўчэга запавету».
**16.30** «Факты».
**17.15** «Уся Расія».
**18.00 Серыял «Сэрца зоркі».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**21.00 Серыял «Бедныя сваякі».**
**22.00 Маст. фільм «Мама паняволі».**
**0.20** «Спецыяльны карэспандэнт».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.30** «Справа ўрачоў».
**9.25, 10.35 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.20** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** «Справа густу».
**14.50** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Пракурорская праверка».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Павуцінне».**
**23.30 Серыял «Кляймо».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.25, 19.45, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30 Прыгоды «Ледзяная дрыготка».**
**9.10** «Тэлемагазін».
**9.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**10.35** «Кінаблакнот».
**11.00 Драма «Падводная лодка».**
**14.30 Серыял «Чарцяня».**
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Незабыўнае Раство».**
**18.05 Серыял «Эўрыка».**
**18.55 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».**
**19.50 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Лінкольн для адваката».**
**23.15 Серыял «Прыгарад».**

## ВТБ

**6.00, 2.30** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 14.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.00** Серыял «Думай як жанчына».
**11.00, 18.00** Серыял «Кухня».
**12.00** Камедыя «Новы хлопец маёй мамы».
**14.30, 17.30, 0.30** «Лаві момант».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00, 23.10** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**16.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**18.30, 0.30** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Халасцякі ў адрыве».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** «Уральскія пельмені».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Вяртанне». Маст. фільм.
**11.50** «Алтайскія кержакі». Дак. фільм.
**12.20, 20.10** «Правілы жыцця».
**12.45** «Пісьмы з правінцыі». Пасёлак Тыксі. Рэспубліка Саха (Якуція).
**13.20** «Уладзімір Стасаў. Цень застылага волата». Дак. фільм.
**14.05** «Пецярбургскія тайны». Серыял.
**15.10** «Галош». Дак. фільм.
**15.45** Білет у Вялікі.
**16.25** Георгу Шолці прысвячаецца... Гала-канцэрт у сімфанічным цэнтры Чыкага. «Сусветны аркестр дзеля міру» пад кіраўніцтвам Валерыя Гергіева.
**18.05** «Парыжская нацыянальная опера». Дак. фільм.
**19.15** Смеханастальгія.
**19.45, 1.55** «Шукальнікі». «Уцёкі брыльянтышчыка Пазье».
**20.30** «Нікаля Ле Флок. Варшаўская сляза». Серыял.
**22.05** Да 70-годдзя Максіма Дунаеўскага. «Лінія жыцця».
**23.20** «У гэты ж час, у наступным годзе». Маст. фільм.
**1.20** «Аляксандр Цфасман. Расійскі джаз — вялікія імёны».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Кінакамера глядзіць у свет». 1982 год.
**7.05, 13.00, 19.00, 1.00** «Прэс-экспрэс».
**7.20, 1.15** Канцэрт замежнай эстрады.
**7.40, 1.40** «Стары Новы год». Тэатральныя сустрэчы ў Доме акцёра. 1993 год.
**8.25** «Тэмп». Фільм-канцэрт з удзелам І. Талькова і групы «Russian Girls». 1991 год.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** Праграма «Час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**11.00, 5.00** «Песня-85».
**12.00, 18.00** Дак. фільм «Хакей Анатоля Тарасава».
**13.20** Фільм-канцэрт «...Жадаем шчасця вам». 1985 год.
**13.55** Тэлеспектакль «Хто ёсць хто?». 1977 год.
**17.00** Канцэрт «Мае любімыя мелодыі». Спявае Муслім Магамаеў. 1966 год.
**19.15** Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
**22.00** «Колба часу».
**23.00** «Кінапанарама». 1983 год.
**0.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока». «Гукі Му». 2006 год. 1-я частка.
**2.40** М/ф «Падаў леташні снег».

## EUROSPORT

**3.00, 21.55, 1.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар.
**10.30, 14.00, 18.15, 1.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**11.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета.
**12.15, 16.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**14.45** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**16.45, 21.00** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**22.00** Снукер. Мастэрс.



**2.30** WATTS.
**2.45** Аўта- і матаспорт.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.10** Серыял «Сваты 3».
**6.55** Камедыя «Зануда».
**8.25** Камедыя «Ёлкі».
**10.55** Камедыя «Мільён на Каляды».
**12.30, 17.00, 19.45, 22.40, 0.45, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**12.45** Камедыя «Ёлкі 3».
**14.30, 17.30, 22.00** Серыял «Кірсці».
**15.20** Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».
**18.20** Камедыя «Прага золата».
**20.20** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**23.10** Камедыя «Няма чаго губляць».
**1.15** Камедыя «Ёлкі 2».
**4.05** Меладрама «Пакуль ты спаў».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50, 14.20** «Доктар І.».
**8.20, 18.55, 0.45** Серыял «Каханне і пакаранне».
**9.55, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.40, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.35, 16.30** «Шчырая размова».
**13.30** Серыял «Аўрора».
**14.50, 0.00** Серыял «Каменская».
**15.45, 22.35, 2.20** «Зорныя гісторыі».
**17.25, 4.00** «Простыя складанасці».
**20.45** Камедыя «У краіне жанчын».
**21.45, 1.00** Серыял «Брыгада».
**23.30** «Гісторыі выратавання».

## ТБ1000

**6.30** Драма «Заганныя сувязі».
**8.00, 15.00** Камедыя «Мадлен».
**9.30** Трылер «Сакавіцкія іды».
**11.15** Трылер «Стэлс».
**13.15** Прыгоды «Падарожжа да Цэнтра Зямлі».
**16.30** Камедыя «Два дні ў Нью-Ёрку».
**18.15** Камедыя «Даю год».
**20.00** Баявік «Напруж звіліны».
**22.00** Драма «Язмін».
**23.45** Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё».
**1.30** Трылер «Чырвоны дракон».
**3.45** Драма «Крывавы дыямент».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Русалка».
**8.20** Мюзікл «Папса».
**10.30** Камедыя «Горка!».
**12.20** Мюзікл «Сезон цудаў».
**14.00** Камедыя «Цётачкі».
**15.40** Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
**17.40** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**20.20** Камедыя «Падарунак з характарам».
**22.00** Драма «Каляфутбола».
**23.40** Драма «Туман».
**2.20** Драма «Дом».
**4.30** Камедыя «Прывітанне, мы ваш дах».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**6.40** Гульні розуму.
**7.10** Займальная навука.
**7.30, 13.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50, 12.40** Зрабі або памры.
**8.10** Машыны: разабраць і прадаць.
**9.00** Шаша праз пекла.
**9.40, 14.10, 19.30** Дыстанцыйнае выжыванне.
**10.25, 15.00, 20.10** Золата Юкана.
**11.10** Мегазаводы.
**12.00, 18.40** Скарбашукальнікі.
**15.45** Атака нільскага кракадзіла.
**16.30** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.10** Дзясятка лепшых фота «Nat Geo» 3.
**18.00, 3.00** Канвой: бітва за Атлантыку.
**21.00, 0.45, 3.45** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**22.30, 5.15** Аферысты і турысты.
**23.10** 80-я: дзесяцігоддзе, якое зрабіла нас.
**0.00, 2.20** Эвакуацыя Зямлі.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Навука магіі.
**9.40, 13.50** Што ў вас у гаражы?
**12.10** У пагоні за выгадай.
**13.00, 7.05** Горш быць не магло.
**14.40, 6.05** Трой.
**15.30** Хлопцы з Юкана.
**22.10** Сапраўдная Аляска.
**23.00** Мяцежнікі ледзянога вазера.
**23.50** Чыгунка Аляскі.
**0.40, 3.35** Каралі аўкцыёнаў.
**1.30** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.



**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**4.25** У пагоні за класікай.
**5.15** Махінатары.

## Zамор'е

## РЭКОРДНЫ ЛАНЦУЖОК

**Залаты ланцужок даўжынёй больш за 5 кіламетраў і коштам амаль 6 мільёнаў долараў выраблены ў Дубаі. Чакаецца, што ён увойдзе ў Кнігу рэкордаў Гінэса як самы доўгі ювелірны выраб з золата. Над яго стварэннем працавалі 100 чалавек на працягу 45 дзён.**



Дакладная даўжыня вырабу, які складаецца з 4 мільёнаў сегментаў — 5,52 кіламетра, вага — 256 кілаграмаў. Стварэнне ланцужка прымеркавана да дваццатага па ліку Гандлёвага фестывалю ў Дубаі, на працягу якога для пакупнікоў у крамах і гандлёвых цэнтрах прапануюцца зніжкі да 70% і праводзяцца розыгрышы прызоў.

Паглядзець на твор ювеліраў можа любы: ён выстаўлены ў старой частцы Дубая, у папулярным сярод турыстаў «залатым кірмашы». Пасля ўстанаўлення сусветнага рэкорду ланцужок будзе распрададзены па частках. Кожнаму бранзалету або ланцужку будзе прысвоены ўнікальны код, які пацвярджае, што яны з'яўляюцца часткай вырабу, які ўвайшоў у Кнігу рэкордаў Гінэса. У 1999 годзе падчас гандлёвага фестывалю ў Дубаі таксама быў выраблены залаты ланцужок з рэкорднай тады даўжынёй 4,28 кіламетра.

## АДКРЫЎ ШАМПАНСКАЕ... КУЛЯЙ!

**Як вы адкаркоўваеце галоўны навагодні напой? Амерыканец Рычард Раян, напрыклад, любіць гэта рабіць пры дапамозе снайперскай вінтоўкі. Ён змог адаткнуць бутэльку шампанскага, стрэліўшы ў яе. Відэаролік, які мужчына размясціў на сваім канале ў YouTube, за тыдзень набраў больш за мільён праглядаў.**

Каб адкаркаваць бутэльку, Раяну спатрэбілася тры спробы. Першыя дзве аказаліся няўдалымі — у выніку стрэлу бутэлькі былі разбітыя. Трэцім дакладным стрэлам амерыканец дамогся патрэбнага выніку. Рычард Раян з 2007 года вядзе на YouTube канал FullMag, прысвечаны зброі.

## НОС РУКАМ У ДАПАМОГУ

**Жыхар індыйскага горада Хайдарабада Махамед Хуршыд Хусейн устанавіў сусветны рэкорд па хуткасным наборы тэксту носам. У прысутнасці экспертаў з Кнігі рэкордаў Гінэса 23-гадовы мужчыну ўдалося надрукаваць фразу, якая складаецца са 103 слоў, за 47,44 секунды.**



Фраза гэтая гучыць так: «Кніга рэкордаў Гінэса выбрала мяне, каб я надрукаваў гэта за самы кароткі час». Каб лепш факусіравацца на клавіятуры, ён заплюшчваў адно вока, а рукі яго былі звязаны за спінай. Каб падрыхтавацца да рэкорду, мужчына апошнія тры гады шмат трэніраваўся штодня. Раней Махамед — а ён, між іншым, інжынер і мае ступень бакалаўра — ужо ўстанаўліваў рэкорд па наборы. У лютым 2012 года яму ўдалося надрукаваць англійскі алфавіт за 3,43 секунды. Але ж гэта было зроблена рукамі.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС**

## НЯДЗЕЛЯ, 18 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20 Меладрама «Залатыя нябёсы».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40, 0.00 Серыял «Каханне ў вялікім горадзе-3».**
**10.45** «Пра ежу!».
**11.20** XXL WOMAN TV.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.05** Тайны следства.
**13.40** Каробка перадач.
**14.15** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**14.45** Нашы.
**15.15** Твой горад.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** «Вялікі рэпартаж».
**16.50** Лёс гігантаў.
**17.20 Драма «А снег кружыць...».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.15 Меладрама «Шукаю цябе».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.55 Фільм-казка «Капітан Крук».**



**9.15** Вышэй за дах.
**9.45** М/с «Аватар. Легенда пра Аанга».
**11.00** «Fitnews».
**11.35** «Зразумець і абясшкодзіць».
**12.10, 20.20** Тэлебарометр.
**12.15, 21.20 Серыял «Інтэрны». Заключныя серыі.**
**13.45** Я хачу гэта ўбачыць.
**14.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Масстарт. Жанчыны.
**15.20 Дэтэктыў «Сустрэчная плынь».**
**17.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Масстарт. Мужчыны.
**18.25** «Comedy Батл». Без межаў».
**19.30** Суперлато.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**22.50** «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
**23.35 Баявік «Слёзы сонца».**



**1.25** «Сустрэча з ...» Вадзім Дзевятоўскі.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00 «Леапард». Драма.**
**11.00** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Юлія Міцько.
**11.40** «Наперад у мінулае».
**12.05** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**13.00** «Застылая музыка Лангбарда». Дак. фільм.
**13.40** «Чвэрць стагоддзя на сцэне...» Канцэрт Аляксандра Саладухі.
**14.35 «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». Дзіцячы фільм.**
**18.00, 23.50** «Культпрасвет».
**18.30 «Апошні рэйд». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**21.10** «Творчы вечар народнага артыста Расіі Аляксандра Міхайлава».
**22.15 «Мужыкі!». Меладрама.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 1.30** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Спрынт. Мужчыны.
**9.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Суонсі» — «Чэлсі».
**10.55** Гандбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Славенія.
**12.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Віцязь» (Маскоўская вобл.).
**14.15** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Хімкі» — «Цмокі-Мінск».
**15.55, 23.40** Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
**17.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Масстарт. Жанчыны.
**18.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Арсенал».
**20.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вест Хэм» — «Хал Сіці».
**22.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдзінг. Масстарт. Мужчыны.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.45** «Фазэнда».
**11.20** «ТБ-таксі».
**11.45** «Адгадай мелодыю».
**12.25** «На край свету».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Кропля ў кроплю». Навагодні выпуск.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Тэатр эстрады».
**23.05 Прыгоды «Жыццё Пі».**



### СТБ

**6.30 Серыял «Студэнты 2».**
**7.20, 17.45** «Аўтапанарама».
**7.50 Меладрама «Тры метры над узроўнем неба. Я цябе хачу».**
**10.00** «Вялікае снеданне».
**10.40, 14.00, 16.50** «Гарады, якія спяваюць».
**10.45** «Тэрыторыя памылак».
**12.30** «Добры дзень, доктар».
**13.05** «Тайны свету».
**14.05 Серыял «NEXT 2».**
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** «Навагодні Задорнаў». Канцэрт.
**18.15** «На тым жа месцы ў той жа час».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Камедыя «Спатканне ўсляпую».**
**22.35** «Пякельная кухня-2».
**23.50 Драма «Каханне».**

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.15** М/ф.
**9.05** «Ведаем рускую».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10, 2.45 Маст. фільм «Прынцэса спецый».**
**11.55** «Нітка да нíткі».
**12.20 Серыял «Яго каханне».**
**16.10, 22.05 Серыял «Эфект Багарне».**
**21.00** «Разам».
**1.00 Маст. фільм «Салодкі і брыдкі».**
**4.30 Маст. фільм «Маё каханне».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Барбі і мядзведзь».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.40** «Ранішняя пошта».
**13.20** «У свеце жывёл».
**14.15** «Кулінарная зорка».
**15.10 Маст. фільм «Жонка Шчірліца».**
**17.00 Маст. фільм «Апошняя ахвяра».**
**18.45** «Смяяцца дазваляецца».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.55 Маст. фільм «Мама, я жанюся».**
**23.45** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05 Серыял «Гончыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.20** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20 Серыял «Дзяржаўная абарона».**
**15.05, 20.00 Серыял «Помста».**
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**23.15** «Новыя рускія сенсацыі».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.25, 18.55, 21.00, 23.20** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.35 Драма «Зорка чароўнага шчасця».**
**13.30 Меладрама «Анёл».**
**15.10 Трылер «Няўлоўны».**
**16.40** «МакаShow».
**16.50** «Сёння клюе».
**17.20** «Тэлемагазін».
**18.00 Серыял «Эўрыка».**
**19.00 Камедыя «Ідэальны муж».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Дзеці Хуанг-Шы».**

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Пашпарт за 24 гадзіны».
**12.30, 22.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**13.00** «Я падаю на развод».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00** Серыял «Супер Макс».
**16.30** Дэтэктыў «Скарб».
**19.00** «Уральскія пельмені».
**20.30** Баявік «Вікінгі».
**23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Нерэальная гісторыя».
**0.00** «Людзі Хэ».
**0.30** «Лаві момант».
**1.00** Скетч-шоу «Валера-ТБ».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Ідэальны муж». Маст. фільм.
**12.05** «Легенды сусветнага кіно». Людміла Гурчанка.
**12.30** «Расія, любоў мая!».
**13.00** Геніі і ліхадзеі. Артур Эванс.
**13.25** «Шырванскі нацыянальны парк». Дак. фільм.
**14.10** «Пешшу...». Масква манастырская.
**14.40** «Што рабіць?».
**15.25** Дзяржаўны акадэмічны рускі народны хор імя М.Е. Пятніцкага.
**16.45** «Хто там...».
**17.15** 100 гадоў з дня нараджэння Барыса Раўшэнбаха. Дак. фільм.
**18.00** «Кантэкст».
**18.40** «Шукальнікі». «Загадкавыя дакументы Рыгора Гапона».
**19.25** Да 70-годдзя Вадзіма Абдрашытава. «Спыніць цягнік». Маст. фільм.
**20.55** «Астравы». Вадзім Абдрашытаў.
**21.40** «Там, дзе цячэ Іардан». Дак. фільм.
**22.10** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Ёнас Каўфман у оперы Рыхарда Вагнера «Лоэнгрын». Ла-Скала.
**1.50** «Цудоўны Гоша». М/ф для дарослых.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00, 0.00** Дак. фільм «Хакей Анатоля Тарасава».
**7.00, 1.00** «Прэс-экспрэс».
**7.15** Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
**9.00, 3.00** Праграма «Час».
**10.00** «Колба часу».
**11.00** «Кінапанарама». 1983 год.
**13.00** «Мелодыі Барыса Макравусава». 1981 год.
**14.10** «Вечар паэзіі. Лужнікі». 1976 год.
**15.35, 20.20** Канцэрт замежнай эстрады.
**16.00, 21.45** Маст. фільм «Мы, ніжэйпадпісаныя».
**17.10** «Баль у Астанкіна, або Сядзі і глядзі». 1991 год.
**18.05** «Пад знакам задыяка. Казярог». 1994 год.
**19.20** Дак. фільм «А што ў вас?».
**20.45** «Вам песня прысвячаецца, або Зноў «Карнавальная ноч». Навагодні кінаканцэрт. 1983 год.
**23.00** «Праграма А». Навагодні спецвыпуск: «Ноч кашмараў». 2-я частка. 1990 год.
**1.20** Фільм-канцэрт «...Жадаем шчасця вам». 1985 год.
**1.55** Тэлеспектакль «Хто ёсць хто?». 1977 год.
**4.00** «Народжаныя ў СССР».
**5.00** Канцэрт «Мае любімыя мелодыі». Спявае Муслім Магамаеў. 1966 год.

### EUROSPORT

**3.15, 12.00, 19.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**10.30** Саначны спорт. Кубак свету. Мужчыны.
**11.15, 19.45** Саннны спорт. Кубак свету. Жанчыны.
**13.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**14.30, 17.30, 18.30** Біятлон. Кубак свету.
**15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**15.45, 1.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**20.15, 22.00** Снукер. Мастэрс. Лондан. Фінал.
**1.00** Ралі. Ралі-рэйд. Дакар.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 14.30, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Кірсці».
**6.45** Камедыя «Ёлкі 3».
**8.25** Камедыя «Прага золата».
**9.45, 12.25, 14.15, 16.55, 19.55, 22.35, 2.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**10.50** Камедыя «Няма чаго губляць».
**12.45** Камедыя «Праведныя разнасколкі». 
**15.20** Камедыя «Вялікі бізнес».
**18.20** Камедыя «Канікулы ў Грэцыі. Усё ўключана».
**20.20** Меладрама «Красуні».
**23.10** Меладрама «Зоймемся каханнем».
**1.15** Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».
**4.05** Камедыя «Мільён на каляды».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10, 5.15** «Свая праўда».
**11.00** «Паненка і кулінар».
**11.30, 2.10** Серыял «Тайны следства».
**14.55** «Жонка. Гісторыя кахання».
**16.15** «Сто пытанняў даросламу».
**17.05** «Без падману».
**17.55** «Доказ віны».
**18.45** Драма «Няскончаныя жыццё».
**20.40** «Без віны вінаватыя».
**21.25** Трылер «Воблаці цемры».
**23.15** «Асцярожна, махляры!».
**23.45** «Часова даступны».
**0.40** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.00** Камедыя «Джэк і Джыл: Каханне на чамаданах».
**7.30** Камедыя «Горад і вёска».
**9.30** Камедыя «28 дзён».
**11.15** Фантастыка «Паралельныя светы».
**13.15** Фантастыка «Галодныя гульні».
**15.45** Трылер «Пакой страху».
**17.45** Баявік «Прылады смерці: Горад касцей».
**20.00** Баявік «Агент пад прыкрыццем».
**21.30** Трылер «Жанчына ў чорным».
**23.15** Драма «7 дзён і начэй з Мэрылін».
**1.00** Трылер «Сакавіцкія іды».
**2.45** Меладрама «Бяспека не гарантуецца».
**4.15** Камедыя «Два дні ў Нью-Ёрку».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Цётачкі».
**8.20** Трагікамедыя «Баламут».
**10.10** Драма «Русалка».
**12.10** Казка «Вечары на хутары паблізу Дзіканькі».
**13.40** Драма «Туман».
**16.30** Драма «Старэйшая жонка».
**18.20** Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
**20.20** Камедыя «Ёлкі 3».
**22.10** Баявік «Брыгада: Спадчыннік».
**0.10** Баявік «Спіраль».
**2.00** Трылер «Асабісты нумар».
**4.20** Мюзікл «Сезон цудаў».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Інжынерныя ідэі.
**6.45** Скарбашукальнікі.
**7.30** Паядынак неперамożных.
**8.10** Гульні розуму.
**8.35** Займальная навука.
**9.00** Навуковыя недарэчнасці.
**9.20** Зрабі або памры.
**9.40** Космас: Прастора і час.
**10.25** Рэальнае паранармальнае.
**11.10** Навука будучыні Стывена Хокінга.
**11.55** Больш чым фокусы.
**12.40, 16.30** Упраўленне натоўпам.
**13.25** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.15** Паветраныя асы вайны.
**14.55** Няўлоўная кошка.
**15.45** Чарада.
**17.10** Гульня ў лікі.
**18.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**18.45** Расследаванні авіякатастроф.
**19.30** Непаражальныя канструкцыі.
**20.15, 2.20, 5.15** Прызнанні нацыстаў.
**21.00, 0.45, 3.45** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**22.30** Фатальная стыхія.
**23.15, 3.00** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.

### DISCOVERY

**8.00** Паляўнічыя на рэліквіі — ламбард.
**8.50, 2.20** Бітва за нерухомасць.
**9.40** Бітвы за кантэйнеры.
**10.30** Чыгунка Аляскі.
**11.20** Хлопцы з Юкана.
**12.10** Мяцежнікі ледзяного возера.
**13.00** Голыя і напалоханыя.
**13.50, 3.10** Анаконда.
**15.30, 22.10** Не спрабуйце паўтарыць.
**16.20, 23.00** Эфект Карбанара.
**17.10, 23.50** Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.
**18.00, 1.30, 5.15** Хуткія і гучныя.
**20.30** Дамы на дрэвах.
**21.20** Акварыумны бізнес.
**0.40** Стальныя мышцы.
**4.50** Маланкавыя катастрофы.




## КАБ НЕ ТОЙ КАПЯЛЮШ...

Міхась жыў як людзі: ніколі ні з кім не скандаліў, працаваў у калгасе, трымаў някепскую гаспадарку, вольныя гадзінкі праводзіў на пчальніку... І толькі тады, калі там не было тэрміновай работы, не раіліся пчолы, выцягваў рыштунак ды ішоў на блізкае возера, каб парыбачыць, адпачыць ад хатніх турбот. Былі ў яго ўлюбёныя месцы, дзе, чакаючы, пакуль возьмецца рыба, мог сядзець гадзінамі...

Вось і ў той дзень з самага ранку ён кінуў жонцы:

— Вера, я на возера... Можа, чаго налаўлю. А ты, калі што, пакліч... Ведаеш, дзе шукаць.

Праз паўгадзіны ён ужо быў на месцы. Разматаў вуды, закінуў іх далей ад берага, прысеў на калоду, якую яшчэ летам укапаў пад лазовым кустом, каб можна было схавацца ад сонца і ветру, — стаў чакаць.

Аднак і на жаль, марна: паплаўкі сталі на месцы і варушыцца нават не збіраліся, а вось мазгі...

Бяда ў тым, што ўчора ўвечары Міхась сустрэў свайго сябрука, пасядзелі з ім, трохі лішняга выпілі...

Карацей, пакуль рыба не бярэцца, вырашыў ён схадзіць у краму — «на піва». Падняўся з калодкі, для размінкі разоў колькі прысеў і, зняўшы капялюш, павесіў яго на сук. Гэта каб іншыя рыбаловы бачылі, што месца занятае...

Колькі ён піў тое піва — гадзіну ці дзве — вёска ўжо забылася, а вось як вяртаўся назад, на возера, памятае дагэтуль.

Значыць, шыбуе Міхась назад і яшчэ здалёку бачыць, што ля вады неяк мнагавата людзей. Нехта з іх на беразе стаіць, нехта — плавае. І голас адтуль... Як быццам жончын:

— А любенькі ж мой! А што ж ты нарабіў? А на каго ж ты мяне пакінуў?..

— Што там зрабілася? — пытае Міхась у нейкага незнаёмца.

— Ды тапельца шукаюць... Капялюш, бач, плавае, а чалавека няма. Значыць, таго... З канцамі...

— Дык там жа мой капялюш, — кажа Міхась. — Я яго на куст павесіў, калі ў краму адыходзіў. Мусіць, ветрам знесла. І вудачкі мае.

Разважаючы так (уголас), падыходзіць бліжэй і...

Нямая сцэна, як у «Рэвізоры»: усе павярнуліся, глядзяць на Міхася. І Вольга, жонка ягоная, уласным вачам не верыць: спачатку абняла гаспадара, абмацала, па галаве да спіне пагладзіла, а потым давай біць па чым папала і прыгаворваць:

— А чорт жа ты лысы! Жывы!.. Дзякуй Богу! А я ж падышла, гляджу — вуды стаяць, капялюш плавае... Я ж думала, ты ўтапіўся.

...З той пары мала хто зваў Міхася па прозвішчы, усё болей тапельцам.

**Мікалай Багданаў,**
*в. Новы Пагост, Мёрскі раён.*

## ...ЧЫМ СЛОВА НАША АДГУКНЕЦЦА

Не так даўно мой стрыечны брат Антось разам з раднёй ды сябрамі спраўляў рубінавае вяселле, і, як у нас гэта водзіцца, недзе пасля трэцяй чаркі пачаліся ў іх звыклыя застольныя размовы, паплылі ўспаміны... Адзін з іх здаўся мне цікавым — як штрых да карціны колішняга жыцця.

Сорак гадоў таму, перад самым яго вяселлем, сваячка, якая ў райвыканкаме займалася ўлікам і размеркаваннем жылплошчы, шапнула Антосю, што ёсць магчымасць цішком убіцца ў жыллёвы кааператыў.

Для маладых гэта быў падарунак лёсу, бо перспектыва гадамі туляцца па чужых кутах альбо дзяліць двухпакаёўку з бацькамі зусім не грэла...

Думкі займала толькі адно: праз месяц з хвастом ім трэба выплаціць першы ўнёсак, а грошай, мякка кажучы, кот наплакаў. Абое палезлі ў пазыкі. Апроч таго, усім запрошаным на вяселле далікатна, у межах прыстойнасці, стараліся давесці, што адразу ж будуць будавацца, а значыць, усялякія там абрусы, сервізы ды ка́пы ім пакуль без патрэбы. Госці, як здавалася, намёк зразумелі, але ж нават пры гэтым у першую шлюбную раніцу высветлілася, што патрэбнай сумы і блізка няма: да яе не хапае аж 870 рублёў...

Гэта быў жах! Маладыя сталі думаць і над тым, у каго б яшчэ пазычыць, і над тым, як жа эканоміць, каб даўгі аддаваць?

Ад «Беламору» Антось адмовіўся яшчэ да вяселля. Цяпер трэба было забыцца пра звыклы куфаль піва пасля працы і абед у рабочай сталоўцы. Замест яго ён вырашыў браць з дому так званы «тармазок»: лусту-другую хлеба з салам, якое час ад часу прывозіў з вёскі.

Чым ахвяруе жонка дзеля будучага дабрабыту, яна пакуль не прыдумала, але ж мазгі працавалі.

Тут варта сказаць, што Антось быў хлопцам досыць прыгожым — з капой кучаравых, доўгіх валасоў. Тады такая мода была. Але ж што да твару халасцяку, тое не дужа пасуе жанатаму...

Факт, што тыдні праз два пасля вяселля Антось з дапамогай начальніка цэха, які вельмі не любіў валасацікаў, усвядоміў, што трэба ісці ў цырульню. Якраз на яе Антось папрасіў у жонкі рубель.

— Тонік! Ты што, — акругліла вочы яго палавіна, — панясеш свае грошы нейкай курыцы?!

— Навошта ты так? — заступіўся за цырульніцу Антось. — Нармальныя там дзяўчаты...

— Ага... Толькі і ведаюць, што з дурняў грошы драць за дзесяць хвілін работы, — гнула сваё маладзіца. — Сядай во на табурэтку, я і сама цябе падстрыгу...

Усумніцца ў здольнасцях жонкі азначала б нарвацца на першы скандал. Таму Тонік пакорліва абхінуўся старой нейлонавай кашуляй і сеў перад люстэркам. Жонка рашуча ўзялася за справу і рабіла яе так пяшчотна, што ўрэшце муж задрамаў...

Стрыжка доўжылася крыху больш за гадзіну. Майстрыха, трэба разумець, старалася, а вось вынік — вочы не бачылі б, як той казаў! Бо спераду Антосева галава стала яўна несіметрычнай, а ззаду яна больш нагадвала толькі што пастрыжаную ножнамі спіну авечкі.

Праўда, у сям'і застаўся рубель...

Якраз яго жонка працягнула Tоніку і сказала, каб купіў батон, бохан чорнага хлеба, літр малака і пачак тварагу.

У краму Антось ішоў нібы зорка эстрады — пад прыцэлам уважлівых позіркаў і шырокіх усмешак.

Яшчэ горш яму стала там, у гандлёвай зале, бо касіркі, разглядаючы яго галаву, нават збіваліся, калі грошы лічылі...

А таму па дарозе дамоў Тонік збочыў у суседні дом да знаёмага. Ён падчас службы ў войску штомесяц стрыг пяхотную роту ды каго-ніхага з малодшых афіцэраў, таму ўсё зразумеў без слоў і па-майстэрску, хвілін за пяць, папраўці жончыну работу, але ж перад гэтым не прамінуў па-мужчынску прама спытаць:

— Слухай, а якая курыца цябе стрыгла?

**В.А.,** *г. Мінск.*

## У БАРАВІКІ!

Мой знаёмец Андрэй — аматар пацягацца па лесе. А чаму б і не — ціш, сасновы водар, птушкі, ягадыгрыбы... Хоць і няшмат іх — за пяць кіламетраў ад Гомеля... «З'ездзіў бы ў Шчэрбаўку, — таўкла яму жонка, — ці ў Васілевічы... Народ адтуль кашамі возіць!».

Андрэй слухаў, але каб некуды ехаць — не, прабачце...

Так было, і хутчэй за ўсё засталося б, калі б у госці да яго не завіталі родны брат з Адэсы, калі б ён, закусваючы пасля першай другой ці пятай падчапіў на відэлец хоць нешта іншае, а то ж выключна баравічкі — жонка два слоічкі на рынку купіла... Праўда, госцю ў гэтым не прызналася. Наадварот: «Андрэева работа, — казала брату, — гэта ён назбіраў!». Андрэй хацеў быў запярэчыць, ды неяк няёмка было: ат, ліха з ім, вырашыў, мая дык мая...

А госць дык раптам зацікавіўся, спытаў: «Сапраўды назбіраў? Ты? Сам?.. А давай удваіх заўтра ў лес з'ездзім! Я ў грыбах ніколі не быў».

Андрэй, ну вядома ж, парываўся адмовіцца, — жонка не дала. Сказала:

— А чаму б і не? Заўтра з раніцы і шыбуйце...

«Куды нам шыбаваць?» — вылупіў вочы гаспадар, не маючы ўяўлення, дзе шукаць не тое што баравікі, нават сыраежкі. Жонка нахілілася да ягонага вуха і ціхутка параіла:

— Нічога страшнага... На вакзале прыгледзішся: у каго з пасажыраў большая тара, дык таго і трымайся. Ён не падвядзе.

...На раніцу такога вось надзейнага грыбніка Андрэй адшукаў адразу і яшчэ на подступах да вакзала: чэмпіён, як піць даць — дзве вялізныя карзіны ў руках, трэцяя, відаць, у заплечніку.

Разам яны зайшлі ў вагон, разам выйшлі з дызеля. Далей пасажыры раздзяліліся — хто падаўся налева, хто направа. А чэмпіён той... дык наперад, па шпалах.

Андрэй з братам, назіркам, падаліся за ім. Кіламетры з два адмахалі — мужык нікуды не збочвае. Азірнуўся, нарэшце, і нырнуў у гушчар. Браты — таксама. Не губляючы дзядзьку з віду, прайшлі праз нейкую ручаіну, праз дзве паляны і балацянку. Прыкмецілі, што мужык нават пад ногі не глядзіць — грыбоў не шукае. «Не іначай кружыць, утойвае «казырныя» мясціны», — думалі браты і ўпарта крочылі следам — аж пакуль мужык... не спыніўся, не сеў, не дастаў падмацунак.

Хавацца далей не мела сэнсу: браты падышлі да яго, павіталіся. Андрэй адкрытым тэкстам спытаў:

— Вы ў баравікі ідзяце?

— Ну, — прызнаўся дзядзька. — А вы куды?

— Мы таксама ў баравікі, — сказаў Андрэй, выцягваючы з заплечніка пляшку. — Возьмеце ў кампанію?

— Ды калі ласка! — узрадаваўся той.

Яны кульнулі па чарцы — за знаёмства, спехам прыкусілі, бо збіраліся хмары, а ісці ім, як высветлілася, вярсты з чатыры яшчэ...

«Далёка, халера! Але ж будзем з грыбамі!» — цешыліся браты і моўчкі шыбавалі за дзядзькам — аж пакуль не ўбачылі абрысы... хат, аж пакуль перад імі не ўзнік указальнік: «Вёска Баравікі». Браты аслупянелі.

— Вы тут да каго? — удакладніў дзядзька.

— Ды мы... Мы ў грыбы — у баравікі...

Дзядзька рагатаў так, што не чуваць было блізкага грому!

Не стрымаліся ад смеху і браты-адэсіты.

...Гісторыя, як і варта было чакаць, скончылася добра. Андрэй з Міколам перачакалі ў Баравіках. Назаўтра — і разам з новым знаёмцам — у ваколіцах вёскі назбіралі грыбоў. Факт, што дамоў паехалі яшчэ і з пачастункам — памідорамі — ад яго ж. Ён, як высветлілася, іх вырошчвае. І потым з поўнымі карзінамі едзе ў Гомель на рынак і з пустымі назад — у Баравікі.

**Уладзімір Пернікаў,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# КАЛЯДЫ ЛЯ РАТУШЫ

### Чаму цудоўныя народныя абрады ў гарадскім побыце ператвараюцца ў збор міласціны

На першы дзень Каляд, акурат пазаўчора, завіталі на наш сёмы паверх калядоўшчыкі — дзеці і падлеткі з нашага дома. Праўда, у тое, што яны калядоўшчыкі, верылі, здаецца, толькі яны самі, дый то не зусім. Стаялі, пераміналючыся з нагі на нагу, пакуль самы смелы не вымавіў: «С Рождеством!». На гэтым калядаванне скончылася, і малыя, пазіраючы з чаканнем, а некаторыя і з адценнем нахабства (чаго, маўляў, стаіш, ідзі па падарункі!) застылі на парозе. Першым жаданнем было, як ужо каторы год раблю, пайсці ў пакой, узяць жменю цукерак ды колькі мандарынаў, сыпнуць ім у пакет і з палёгкай зачыніць дзверы. Але гэтым разам стала чамусьці вельмі шкада іх, бо адчуванні, якія яны выклікалі гэтым нязграбным і няўмелым калядаваннем, нічым не адрозніваліся ад тых, што застаюцца пасля сустрэчы з жабракамі: і прыкра, і хочаш як мага хутчэй пазбавіцца ад іх кампаніі...

І я не пабегла па цукеркі. Я таксама нахабна сказала: «А пакалядаваць? Масак і касцюмаў у вас няма, дык хоць песню калядную заспявайце!» «Калядоўшчыкі» няёмка пераглядаліся і, здаецца, гатовы былі кінуцца наўцёкі. І тады я сама пачала: «Учора звячора засвяціла зора. Зора засвяціла, свет узвесяліла. Свет узвесяліўся — Хрыстос нарадзіўся!»... Карацей, гэту нескладаную калядку мы вывучылі хвілін за дзесяць. Гэты час я патрацiла недарэмна: чула, як на парозе ў суседзяў малыя нястройным хорам зацягнулі менавіта яе.

Я не першы раз і не толькі ў сваім цяперашнім жытле на Каляды і на Вялікдзень назіраю падобную няўмелую спробу «пакалядаваць» ці «схадзіць у валачобнікі». Было падобнае і ў старой «хрушчоўцы» ля Чэрвеньскага рынка, і ў інтэрнаце «Кераміна», працягваецца і ў сухараўскай высотцы. Там, дзе збіраецца супольнасць людзей, большасць якіх маюць карані ў вёсцы (а ў нашай краіне гэта з'ява тыповая для любога горада), рана ці позна пачынаюцца спробы гэтыя карані на гарадскую глебу прыжывіць. І пачынаюцца, як правіла, з самых простых, агульнавядомых, «растыражаваных» традыцый. Праўда, выпраўляючы дзяцей, якія ўжо «самыя гарадскія гараджане», выконваць гэтыя традыцыі, бацькі ім не тлумачаць ні сутнасць, ні сэнс, ні тое, як гэта рабіць. Абмяжоўваюцца, як правіла, чымсьці кшталту: трэба ўзяць як мага большую торбу і павіншаваць суседзяў са святам. Не ведаю, з-за чаго так адбываецца: ці то ў дарослых не хапае часу, ці то яны самі ўжо нічога не памятаюць, ці то настолькі стараюцца «выціснуць з сябе вёску», што прымусілі сябе забыцца. У выніку маем тое, што маем: прыгожы святочны абрад, які па сутнасці сваёй — сапраўднае тэатралізаванае дзейства, накіраванае на пажаданне (навукоўцы скажуць: на мадэляванне) здароўя і дабрабыту, ператвараецца ў нашых гарадскіх дамах у сапраўднае збіранне міласціны. Калядоўшчыкі не спяваюць і не скачуць, а стаяць амаль літаральна з працягнутымі рукамі, а тыя, для каго «калядуюць», зусім не радуюцца, а спяшаюцца кінуць у торбу гасцінцы ды з прыкрасцю зачыніць дзверы.

Мне шчыра шкада гэтых дзяцей, і шчыра шкада ўсіх нас. Бо, падросшы і паразумнеўшы, яны гэткае сваё «далучэнне да спрадвечнага» будуць успамінаць самае меншае з сорамам. І ўжо дакладна не захочуць, каб штосьці падобнае адчулі пасля іх дзеці. А значыць, не будзе нават кволых спроб вярнуць у сучаснае шалёнае жыццё тое роднае і цёплае, што сагравала многія пакаленні да нас. І гэта роднае і цёплае знікне з жыцця назаўсёды і застанецца толькі сцэнічнымі нумарамі фальклорных гуртоў. І адбудзецца гэта з-за таго, што мы, тыя, каму сёння сорак-пяцьдзесят, хто яшчэ ведае і памятае, не спяшаецца дзяліцца гэтымі ведамі і памяццю са сваімі ўжо рафінаванымі гарадскімі нашчадкамі. І сумленне ў нас чыстае: мы ж шануем традыцыі (на святы фактычна ператвараючы дзяцей у звычайных, па вясковым разуменні, пагарэльцаў).

Тым малым, што да мяне пазаўчора прыходзілі, я дарма не расказала пра тое, як на Каляды рыпіць снег пад палазамі санак, як пахне на марозе сена, як з каня, які бяжыць амаль галопам, ідзе казачная пара, якую не паўторыць ніводзін спецэфект, а над галавой у чорным халодным небе складаюцца ў адмысловыя зімовыя ўзоры дыяментавыя зоркі. Ці пра тое, як перад варажбой на аладках мы так накармілі сабаку цёткі Ядзі, што калі яму настала пара гэтыя аладкі есці, тым самым прарочачы, хто з нас раней выйдзе замуж, ён проста паваліўся на бок і нават ніводнай не панюхаў. Ці пра тое, як запісвалі на магнітафон ад мясцовых бабуль старыя калядныя песні, каб самім вывучыць. А калі пайшлі калядаваць, хлопцы да нашага хору на ўсю моц уключылі і магнітафонны запіс, і гаспадары спалохана выбягалі з хат, не разумеючы, што гэта за натоўп пад вокнамі так нястройна галосіць... Пра Свята, якое, як і дзяцінства, заўсёды з табой; якое, роднае і цёплае, саграваe нават у самую сцюжу, ратуе ад самоты і адчаю. Якое было — сапраўднае, а не складзенае па камп'ютарнай праграме...

...Нядаўна ў адным інтэрв'ю вядомы польскі рэжысёр разважаў пра многія рэчы, у тым ліку і пра ментальнасць беларусаў (нашых суседзяў наша ментальнасць чамусьці вельмі хвалюе). Дык вось, на яго думку, мы яшчэ самі не вызначыліся, хто мы такія: ці то сяляне па сутнасці сваёй (і тады нам дарога назад — у XIX стагоддзе), ці то гараджане, і тады мы сапраўдныя еўрапейскія насельнікі стагоддзя XXI. Шаноўны пан паблажліва адзначыў: у беларусаў, маўляў, будучыня добрая, бо ў Мінску аднавілі ратушу — сімвал гарадскога жыцця, а ўвесь прагрэс, усё развіццё — менавіта ў горадзе, і няма нам чаго на тую вёску азірацца...

Пан, пэўна, не ведае, што ратушу тую па архіўных крыніцах адрадзілі, спраектавалі і пабудавалі ў большасці сваёй сялянскія дзеці.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

ЕВРОТОРГ ИНВЕСТБАНК

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ
## Открытого акционерного общества «Евроторгинвестбанк» третьего и четвертого выпусков

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
29.12.2014
____________________ Сушко С.А.

**1. Наименование эмитента**

Наименование эмитента на белорусском языке:

полное – адкрытае акцыянернае таварыства «Еўраторгінвестбанк»;

сокращенное – ААТ «Еўраторгінвестбанк»;

наименование эмитента на русском языке:

полное – открытое акционерное общество «Евроторгинвестбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк», «Эмитент»);

сокращенное – ОАО «Евроторгинвестбанк».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220075, г. Минск, пер. Промышленный, д. 11;

телефон: (017)2622665; факс: (017)2622321;

адрес в интернете: www.etib.by;

e-mail: info@etib.by.

**3. Номера счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи**

Денежные средства при проведении открытой продажи облигаций ОАО «Евроторгинвестбанк» третьего и четвертого выпусков (далее – облигации) будут зачисляться на следующие счета, открытые в ОАО «Евроторгинвестбанк», код 735, УНП 807000043:

для третьего выпуска – №4940800039745;

для четвертого выпуска – №4940800048404.

**4. Наименование периодического печатного издания, определенное эмитентом для раскрытия информации, сроки ее публикации**

Публикация бухгалтерской отчетности Банка осуществляется в газете «Звязда» ежеквартально не позднее тридцати календарных дней после окончания отчетного квартала, ежегодно – не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации Банка (если такое решение будет принято), о возбуждении в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), об изменениях, внесенных в Проспект эмиссии облигаций Открытого акционерного общества «Евроторгинвестбанк» третьего и четвертого выпусков (далее – Проспект эмиссии) публикуется в газете «Звязда» не позднее тридцати календарных дней.

С данной информацией можно ознакомиться также на официальном сайте Банка по адресу: www.etib.by.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его место нахождения, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия специального разрешения (лицензии)**

Наименование депозитария: ОАО «Белинвестбанк».

Место нахождения: 220002, г. Минск, пр-т Машерова, 29.

Дата и место государственной регистрации: зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 03.09.2001 за №807000028.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1103 выдано Министерством финансов Республики Беларусь.

Срок действия лицензии – до 16.03.2024.

**6. Размер уставного фонда эмитента**

Размер зарегистрированного уставного фонда Банка составляет 341 516 070 000 (Триста сорок один миллиард пятьсот шестнадцать миллионов семьдесят тысяч) белорусских рублей.

**7. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 25.02.2002, регистрационный №807000043, как Открытое акционерное общество «Международный резервный банк» и переименован в Открытое акционерное общество «Евроторгинвестбанк» в соответствии с решением Общего собрания акционеров Банка от 12.12.2012, протокол №6. Изменение наименования зарегистрировано 21.01.2013 (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь №45).

**8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии**

С более подробной информацией и Проспектом эмиссии можно ознакомиться, начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста настоящей Краткой информации:

- в Казначействе Банка по адресу: 220040, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Л. Беды, д. 2Б ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 9.00 до 15.00.

- на интернет-сайте Банка: www.etib.by.

**9. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о выпуске облигаций Банка в соответствии с п.п.11.19.2 Устава Банка принято Наблюдательным советом Банка 17.12.2014, протокол №31.

**10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций**

Банк осуществляет эмиссию именных бездокументарных, процентных, неконвертируемых облигаций третьего и четвертого выпусков:

| Номер выпуска | Объем эмиссии по номинальной стоимости | Количество облигаций, штук | Серия, номера облигаций | Номинальная стоимость облигации |
|---|---|---|---|---|
| 3 | 100 000 000 000 белорусских рублей | 100 000 | ОБ-3, 000001-100000 | 1 000 000 белорусских рублей |
| 4 | 10 000 000 долларов США | 10 000 | ОД-4, 000001-010000 | 1 000 долларов США |

**11. Номинальная стоимость облигаций**

Номинальная стоимость облигаций:

- третьего выпуска – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей;

- четвертого выпуска – 1 000 (Одна тысяча) долларов США.

**12. Цель выпуска облигаций**

Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для пополнения ресурсной базы Банка. Средства, полученные от размещения облигаций, будут направлены на выполнение задач, предусмотренных Уставом Банка.

**13. Период проведения открытой продажи облигаций**

После опубликования в газете «Звязда» Краткой информации, заверенной в установленном порядке Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (далее – Департамент по ценным бумагам), Банк проводит открытую продажу облигаций с 15.01.2015 по 16.01.2017 включительно, если иной срок не будет определен Правлением и Наблюдательным советом Банка. Открытая продажа облигаций прекращается в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

**14. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Открытая продажа (размещение) облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке и/или в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа) (г. Минск, ул. Сурганова, 48а) в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Покупателями облигаций на первичном рынке могут быть юридические лица и индивидуальные предприниматели – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь.

Оплата облигаций при их покупке осуществляется в валюте номинала в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Для приобретения облигаций юридические лица (индивидуальные предприниматели) могут обращаться в Казначейство Банка (220040, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Л. Беды, д. 2Б, тел. (017)2622665, факс (017)2622321) ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 9.00 до 15.00.

На биржевом рынке размещение облигаций осуществляется через торговую систему Биржи. Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с Регламентом торгового дня по сделкам купли-продажи ценных бумаг в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа». Нерезиденты Республики Беларусь могут приобретать облигации в соответствии с требованиями действующего законодательства Республики Беларусь.

В день начала открытой продажи облигаций и дни выплаты процентного дохода облигации продаются по номинальной стоимости. В последующие дни облигации продаются по текущей стоимости.

Текущая стоимость облигации рассчитывается на дату совершения операции по формуле:

$$С=Н+Дн,$$ где:

С – текущая стоимость облигации;

Н – номинальная стоимость облигации соответствующего выпуска;

Дн – накопленный процентный доход.

Накопленный процентный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Дн = \frac{Н \times П}{100} \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$ где

Дн – накопленный процентный доход по облигации за соответствующую часть процентного периода;

Н – номинальная стоимость облигации соответствующего выпуска;

П – ставка процентного дохода, равная:

- для облигаций третьего выпуска 21,0 проценту годовых;

- для облигаций четвертого выпуска 6,0 процентам годовых;

Т365 – количество дней соответствующей части периода начисления процентного дохода, приходящейся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней соответствующей части периода начисления процентного дохода, приходящейся на календарный год, состоящий из 366 дней.

День начала размещения облигаций или установленная в настоящем документе дата выплаты дохода по облигации и день расчета текущей стоимости облигации считаются одним днем.

**15. Срок обращения облигаций**

Срок обращения облигаций – 1 826 календарных дней (с 15.01.2015 по 15.01.2020).

При расчете срока обращения облигаций день начала размещения и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

**16. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения облигаций – 15.01.2020. Дата окончания погашения облигаций совпадает с датой начала погашения облигаций.

**17. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты**

По облигациям установлен постоянный процентный доход (в дальнейшем именуемый «доход») в виде фиксированного процента к номинальной стоимости облигации, выплачиваемый владельцам облигаций периодически в соответствии с Графиком выплаты процентного дохода, указанным в пункте 19 настоящего документа. Ставка дохода устанавливается:

- для облигаций **третьего выпуска** в размере **21,0** (Двадцать один) процент годовых;

- для облигаций **четвертого выпуска** в размере **6,0** (Шесть) процентов годовых.

Доход выплачивается:

на основании реестра владельцев облигаций, сформированного депозитарием Банка за 2 (Два) рабочих дня до даты выплаты дохода (даты формирования реестра указаны в пункте 19 настоящего документа);

путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь суммы дохода в валюте номинала облигации на счета владельцев облигаций, являющихся таковыми по состоянию на дату формирования реестра владельцев облигаций.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в валюте номинала соответствующего выпуска облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, депонируется на счете Банка и выплачивается после письменного обращения владельца облигаций, содержащего актуальные банковские реквизиты. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

Величина дохода по облигации рассчитывается по формуле:

$$Д = \frac{Н \times П}{100} \times \left(\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}\right),$$ где

Д – доход по облигации за соответствующий процентный период, выплачиваемый периодически в течение срока их обращения;

Н – номинальная стоимость облигации;

П – ставка процентного дохода, равная:

- для облигаций третьего выпуска 21,0 проценту годовых;

- для облигаций четвертого выпуска 6,0 процентам годовых;

Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;

Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Расчет осуществляется по каждой облигации, исходя из фактического количества дней в году, с округлением:

- с учетом двух знаков после запятой до целого числа по правилам математического округления – для облигаций третьего выпуска;

- с учетом трех знаков после запятой до двух знаков по правилам математического округления – для облигаций четвертого выпуска.

**18. Период начисления процентного дохода по облигациям**

